
Браньскія астанкі ☞ 3


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ


а. АНДРЭЙ БЕРАЗАВЕЦ ☞ 9




http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 51 (2536) Год XLIX Беласток, 19 снежня 2004 г. Цана 2,00 зл.


*Планаваныя ваяводскія выдаткі асабліва крануць культуру. У рамках дамоў ваяводскага самаўрада з гміннымі і павятовымі іхныя ўстановы культуры могуць разлічваць на няцэлыя 260 тыс. зл...*

# Бюджэтныя прымеркі

Бюджэт на наступны год на Падляшшы не дадае аптымізму. На інвестыцыі плануецца ледзь 13,3 прац. Усё паказвае на тое, што менш грошай будзе на і так недаінвеставаную культуру.

Намеснік бурмістра Бельска-Падляшскага Міраслаў Галэмбёўскі заявіў, што ў яго гміне адна з найважнейшых праблем гэта школьніцтва — падставовае і гімназічнае. Ваяводскі самаўрад у гэтай сферы не ў змозе памагчы, бо гэта не ягоная „дзялянка”; фінансаванне падставовай і гімназічнай асветы залежыць ад сродкаў прызначаных з цэнтральнага бюджэту.

— Усё маніпулюецца алгарытмам. Лік дзяцей усё падае, а грошы ідуць за дзяцьмі. Мы прымушаны спалучаць класы, — кажа віцэ-бурмістр.

На практыцы ваяводскі самаўрад можа галоўным чынам падтрымаць гміны і паветы шляхам фінансавання дарог, якія пралягаюць праз іх тэрыторыю.

— Стараемся разам з ваяводскімі ўладамі здабыць грошы на мадэрнізацыю дарогі Беласток — Гайнаўка і на галоўныя дарогі ў Гайнаўцы, — заяўляе гайнаўскі стараста Уладзімір Пятрочук.

Фактычна, грошай на гэтую мэту прыходзіцца пашукаць па-за ўласным — павятовым ці ваяводскім — бюджэтам. Падляшская ўправа ваяводскіх дарог у маштабе ўсяго рэгіёна на капітальныя рамонты дарог намерваецца ў 2005 годзе прызначыць ледзь 4,4 млн. зл. Гэтага хопіць на рамонты паверхні дарог — 52 тыс. кв. м. ды рамонты тратуараў і з’ездаў — 12,5 тыс. кв. м.

Пераглядаючы праект ваяводскага бюджэту на наступны год, кідаецца ў вочы факт, што на арганізаванне і датаванне рэгіянальных пасажырскіх перавозаў грошай будзе столькі ж, што ў бягучым годзе, значыць, 9 млн. зл. Прызначэнне квоты на такім узроўні давяло да ліквідацыі спалучэнняў м.інш. у паўднёва-ўсходняй частцы ваяводства. Цяжка сабе ўявіць рэалізацыю абяцання аб куплі чарговых рэйкавых аўтобусаў, паколькі кошт тае задачы быў акрэслены на ўзроўні каля 79 тыс. зл.

Планаваныя ваяводскія выдаткі асабліва крануць культуру. У рамках дамоў ваяводскага самаўрада з гміннымі і павятовымі іхныя ўстановы культуры могуць разлічваць на няцэлыя 260 тыс. зл. Ваяводскі асяродак анімацыі культуры, які арганізуе шмат мерапрыемстваў таксама ў супрацоўніцтве з іншымі ўстановамі ў глыбінцы, атрымае крыху больш за 1 млн. зл. Мае гэтага хапіць на 320 мерапрыемстваў, арганізацыю заняткаў для блізка 140 удзельнікаў пастаянных груп і выдавецкую дзейнасць.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Падляшская ўправа ваяводскіх дарог у маштабе ўсяго рэгіёна на капітальныя рамонты дарог намерваецца ў 2005 годзе прызначыць ледзь 4,4 млн. зл. Гэтага хопіць на рамонты паверхні дарог — 52 тыс. кв. м. ды рамонты тратуараў і з’ездаў на паверхні — 12,5 тыс. кв. м*

Як заявіў падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі, канчаткова фінансаванне культуры залежыць у значнай ступені ад саміх культурных устаноў, паколькі ад наступнага года датацыі будуць назначацца аб’ектыўна, значыць, на рэалізацыю канкрэтных праектаў, з канкрэтнай ідэяй і з бізнеспланам.

Маршалак казаў таксама, што першым прыярытэтам у наступным годзе мае быць „пераламанне камунікацыйных бар’ераў”. А значыць гэта перш за ўсё больш грошай (атрыманых галоўным чынам звонку) на дарогі і падрыхтоўку да пабудовы аэрапорта ў Беластоку:

— У справе лётнішча вядзем размовы з міністрам гаспадаркі. Я знайшоў зразуменне для нашых рацый. Міністр запэўніваў, што на падрыхтоўку гэтага праекта знойдзецца ў бюджэце краіны каля 20-30 млн. зл.

Незалежна ад фінансавых цяжкасцей, падляшская ўправа рыхтуе новую інвестыцыю: Цэнтр зімняга спорту „Шэльмэнт” (у гміне Шыплішкі). Маюць тут узнікнуць скаты і бугельныя пад’ёмнікі, шляхі з’ездаў з нізкім узроўнем цяжкасцей, сноўбард-парк, крэсельны пад’ёмнік разам з усёй інфраструктурай. На пачатак на дапрацоўку дакументацыі таго мерапрыемства прызначана трохі больш за паўмільёна.

Узровень ваяводскіх фінансаў у наступным годзе залежыць у значнай ступені ад прыдбання грошай з еўрасаюзных сродкаў і з урадавых праграм.

**Лукаш Баравіцкі**

*У наступным 52-м нумары „Нівы”*

# Беларускі каляндар на 2005 год

## Фаталізм ☞ 2

Мікола Ваўранюк

*Не было тэлеспраавздачы з кіеўскага Пляцу Незалежнасці без бел-чырвона-белых сцягоў у кадры. Не было ў тыя дні беларуса, які б не перажываў за падзеі на Украіне. І, мабыць, няма нікога, хто б не жадаў украінцам, каб збылося тое, чаго самі хочуць. Каб самі выбралі ўласны лёс. Хай сабе не ідэальны (такога не бывае), але свой...*

## Крамлёўская вайна ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

*25 гадоў таму — 27 снежня 1979 года — СССР пачаў інтэрвенцыю супраць Афганістана. Перамогі і славы Маскве гэтая акупацыя не прынесла — за дзесяць год жудаснай вайны толькі па афіцыйных звестках загінула больш 10 тысяч савецкіх салдат і афіцэраў. Амаль 800 трунаў (мяркую, лічбы заніжаныя) выпала на долю беларускіх сем’яў...*

## Паграпераход ☞ 4

Аляксей Мароз

*Перад адкрываннем паграпераходa перасцерагалі жыхары Чаромхі. Яны адмоўна ацанілі дзейнасць пагранічнага перахода побач сваёй мясцовасці. Звярталі ўвагу на малыя фінансавыя карысці ад прыезду турыстаў з-за ўсходняй мяжы. Прыхільнікі адкрывання паграпераходa паінфармавалі, што звыш 20 гадоў...*

## Пошукі сваіх ☞ 5

Зося Лемеш

*У Гайнаўскім беларускім ліцэі не трэба было шукаць сваіх. Не было проста ніякіх „чужых”. Усе мы былі насамрэч аднолькавыя, хаця некаторыя лічылі сябе тутэйшымі, іншыя праваслаўнымі палякамі, частка беларусамі, а астатнім было „усё раўно”. А тут? Тут таксама ведаю, хто ёсць хто, але гэта таму, што ад самага пачатку даследую, „правяраю” людзей...*

## Скрабляцкі ☞ 8

Аляксандр Вярбіцкі

*У бежанства выехала ўся вёска, а будынкі рускае войска спаліла датла. Калі ў 1918 годзе бежанцы сталі вяртацца ў родныя Скрабляцкі, капалі зямлянкі з адным аконным праёмам. На ўсю вёску толькі адзін конь быў. А неўзабаве, у 1920 годзе зноў нахлынула вайна...*

## Успамін настаўніка ☞ 11

Васіль Сакоўскі

*Я вельмі люблю сустракацца з бацькамі сваіх вучняў, а найбольш на бацькоўскіх сходах, званых „вывядоўкамі” ў нас. Ой, які гэта быў цікавы, прасталінейны народ. Цяпер ужо зусім не тое. І калі, бывала, сумееш падысці да іх і выклікаць іх на шчырасць, вось дзе наслухаешся цікавых спраў...*



# Добрасуседства і фаталізм

*2015 год. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка гуляе з маленькім унукам у коці-лапці. Час ад часу пераківуцца слоўцам-двума:*

*— А кім жа ты, унучак, хочаш быць, як дарасцеш?*

*— Прэзідэнтам Беларусі.*

*— Ой, дурненькі ты, нашто Беларусі два прэзідэнты?*

*Анекдот невясёлы (ніхто нам не абяцаў, што ў гэтым жыцці будзем адно смяяцца), затое праўдзівы. Пачуў я яго ў Беларусі перад апошнімі выбарамі ў тамашні Вярхоўны Савет ды сумна вядомым канстытуцыйным рэферэндумам. Праўда анекдота не ў тым, што ён дакладна прадказвае будучыню, а ў тым, што адлюстроўвае сённяшні дзень. У ім праўда пра нас саміх. Нас, якія нешта робім, але без веры ў поспех „нашай безнадзейнай справы”. Нават калі заробімся па пахі, будзе не так як мы хочам, а так як вырашыць нехта іншы. Або як запісана ў зорках.*

*Не трэба мусіць тлумачыць, што такіх гісторый не расказваў бы прыхільнік дасконнага панавання Лукашэнкі на мінскім пасадзе. Не быў гэта таксама тып усходнеславянскага фаталіста, які верыць, што ўсё будзе добра, абы нічога не рабіць, каб не сапсаваць. Анекдот распавёў мне сімпатычны малады чалавек, ангажаваны ў выбарчую кампанію незалежнага кандыдата ў дэпутаты. Чалавек, якому неабыякава, у якой Беларусі будзе жыць. Таму, менавіта, і падключыўся ў выбарчую кампанію, насуперак усім тым, хто казаў: „нявартa”. Але без асаблівай веры ў тое, што „варта”.*

*Так было ў цёплым кастрычніку ў Мінску. Інакш — у халодным лістападзе ў Кіеве. Хоць спадзяванні на падтасоўку рэчаіснасці і тут, і там былі падобныя. Хоць у вялікай ступені тыя спадзяванні спраўдзіліся, розная на іх была рэакцыя. У Кіеве іменна паверылі, што „варта”!*

*Ці тая новая вера будзе пашырацца і на Беларусь? Невядома. Патэнцыяльныя вернікі ёсць. Не было тэлеспраўаздачы з кіеўскага Пляцу Незалежнасці без бел-чырвона-белых сцягоў у кадры. Не было ў тыя дні беларуса, які б не перажываў за падзеі на Украіне. І, мабыць, няма нікога, хто б не жадаў украінцам, каб збылося тое, чаго самі хочуць. Каб самі выбралі ўласны лёс. Хай сабе не ідэальны (такога не бывае), але свой!*

*Польшча таксама перажывае за Украіну. Па-рознаму. Ёсць вялікія жэсты, як выступленне Валэнсы на дэманстрацыі ў Кіеве. Ёсць важныя ўчынкі, якія мецьмуць свае паслядоўнасці: Квасьнеўскі за круглым сталом паміж Ючанкам з аднаго ды Кучмай і Януковічам з другога боку. Ёсць і менш стаючыя прыклады, як хаця б аднабаковыя карэспандэнцыі журналістаў. Ёсць неверагодныя палітыкі, як Міхал Камінскі, які крыху раней у сябе лае немцаў, а ягоная партыя бароніць Польшчу ад нацменаў. Урэшце, ёсць жэсты правінцыйных палітыкаў. Як заўсёды, спозненыя, паўтораныя за кімсьці іншым, смешнаватыя.*

*Беласток адрэагаваў на падзеі ва Украіне позна. Калі там ужо амаль дагаварыліся. Але, можна сказаць, адрэагаваў годна. На дэманстрацыю салідарнасці з Кіевам пад помнік Пілсудскаму выйшаў сам прэзідэнт горада са сваімі намеснікамі. Быў старшыня мясцовай „Салідарнасці” і некалькі іншых тузоў з правага боку палітычнай сцэны, якія запэўнівалі, што так як „Jeszcze Polska nie zginęła”, так сама „Шчэ нэ вмэрла Україна”!*

*Высакародны ўчынак — выцягнуць руку з помаччу суседу. Асабліва, калі тая дапамога нічога не каштуе, а сусед далёка. На пытанне, чаму нікога з гэтых паноў не было ў месцы, дзе гучаў гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі”, адказ падсоўвае анекдот, які я таксама пачуў у Беларусі. Расказваў яго вядомы настаўнік і краязнаўца Алесь Белакоз з Гудзевічаў яшчэ ў часы СССР, калі мы ўсе праграмна любілі бедных неграў і не любілі іх капіталістычных эксплуататараў.*

*Вось у той час прыходзіць да спадара Белакоза сусед п'яніца з намерам выцягнуць пару капеек на пахмелку. Каб прыпадабацца інтэлігенту, пачынае плакаць над горкім лёсам неграў у ЗША і клясціся ў шчырай любові да іх бедных.*

*— А за што ты, Васіль, калі ты такі чалавекалюбец, пасварыўся з Рыгорам з-за плота? — спытаў яго настаўнік.*

*— Я яго, б..., забіў бы! Такі мне ён ненавідны! — Васіль так больш-менш думаў пра ўсіх блізкіх суседзяў.*

**Мікола Ваўранюк**



# Крамлёўская вайна

*Зіма для Расіі — пара вайны. Спрадвеку расіяне „любілі ваяваць” (словазлучэнне гучыць дзіка, але па-іншаму і не выславішся) менавіта ўзімку, калі на акупаванай тэрыторыі замярзалі балоты, а ў гарах не было расліннасці. Праз стагоддзі нічога не змянілася. Найноўшая гісторыя пацвярджае гэта. 25 гадоў таму — 27 снежня 1979 года — СССР пачаў інтэрвенцыю супраць Афганістана. Перамогі і славы Маскве гэтая акупацыя не прынесла — за дзесяць год жудаснай вайны толькі па афіцыйных звестках загінула больш 10 тысяч савецкіх салдат і афіцэраў. Амаль 800 трунаў (мяркую, лічбы заніжаныя) выпала на долю беларускіх сем'яў. Балазе яшчэ, што на чале імперыі зла апынуўся Міхаіл Гарбачоў, які зразумеў абсурднасць сітуацыі. Ён, напэўна, адзіны ў Крамлі шчыра верыў у „социализм с человеческим лицом”, але таго было дастаткова, каб спыніць ганебную захопніцкую вайну.*

*Дзесяць гадоў таму — 11 снежня 1994 года ўрад ужо Расіі паслаў федэральныя войскі і войскі Міністэрства ўнутраных спраў у Ічкерыю. Супраць прэзідэнта Чачэнскай Рэспублікі Джахара Дудаева і чачэнскага народу пачаліся баявыя дзеянні. Першую ваенную кампанію цудам удалося спыніць. Зноў варта згадаць пра ролю асобы ў гісторыі. Аляксандр Лебедзь, ледзь не адзіны з буйных палітыкаў Расіі, здолеў глянуць на свет шырэй імперскіх амбіцый. Зразумела, што пазней яго верталёт разбіўся невыпадкова. Тым часам ішла ўжо другая захопніцкая хваля. Але да чаго прывяла гэтая вайна? Крамлёўскія стратэгі фактычна ўшчэнт зруйнавалі ічкерыйскую сталіцу Грозны, здзейснілі чарговы жудасны этнацыд, кінулі ў жорны вайны тысячы сваіх маладых хлопцаў, але так і не дабіліся мэты. І не даб'юцца. Надыдзе вясна і пачнуцца новыя маштабныя ваенныя дзеянні. Пакуль будзе жывы хоць адзін чачэнец — вайна будзе доўжыцца. Скончыць яе можна толькі двума шляхамі — альбо Расія выведзе войскі і пачне мірныя перамовы, альбо фізічна мусіць вынішчыць усіх (!) чачэнцаў. У другім разе Пуцін стане на адзін ровень са Сталіным і Пол Потам. Але ўжо, пры кожным зыходзе, можна канстатаваць — Расія пацярпела паразу.*

*Прыгадаю яшчэ адну круглую дату. Дзесяць год таму — 5 снежня 1994 года ў Будапешце на сустрэчы кіраўнікоў краін-удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Аляксандр Лукашэнка ад імя Беларусі падпісаў Мемарандум аб гарантыях бяспекі Беларусі. Сваімі подпісамі гэты мемарандум замацавалі кіраўнікі ЗША, Вялікабрытаніі і Расійскай Федэрацыі. Былі прыняты дакументы, якія на міжнародным роўні гарантавалі Беларусі, Казахстану і Украіне іх незалежнасць, суверэнітэт і існыя межы. Цана афіцыйнага слова Крамля добра вядомая. Замест будовы зычлівых партнёрскіх стасункаў з суседзямі, Масква пачала садзіць на прэзідэнцкія пасады былых савецкіх рэспублік сваіх марыянетак. Пра сродкі і метады і казаць лішне. Масква стала адраджаць савецкую імперыю. Як сімвалічна абрэвіятура СНД (Садружнасць незалежных дзяржаў) на слых падобная на іншую — СНІД (Сіндром набытага імуна-дэфіцыту)!*

*Цяпер крамлёўская імперская палітыка з трэскам церпіць крах. Летась сапраўдную незалежнасць здабыла Грузія. Сёлетнім лістападам паўстала Украіна. Выбух нацыянальнай свядомасці набыў такія маштабы, якія не здолелі спрагназаваць нават сама дасведчаныя аналітыкі. А колькі на „ціхую вайну” супраць Украіны Масквою было выдаткавана грошай, які задзейнічаны велізарны штат спецслужбоўцаў?! Тая сама палітыка і ў дачыненні да Беларусі. Пацвярджэнне таму — пасля ўкраінскіх падзей палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі прадказальна набіраюць размах.*

*Але крамлёўскія ідэолагі аніяк не могуць уцяміць некалькі рэчаў. Па-першае, шматвяковая гісторыя перманентных расійскіх войнаў выразна паказвае, што колькі б Масква не нішчыла іншыя народы, скарыць іх не ўдаецца. Можна забіць аднаго, сто, сотні тысяч людзей, але не знішчыць народ, які з Божае ласкі ўсё адно адраджаецца. Па-другое, калі Расія вае, нішчыць найперш сябе. Часам мне найбольш шкада менавіта расійскі люд, які і так спакутаваўся за ХХ стагоддзе. Бо крамлёўская вайна нясе не толькі фізічныя, але і маральныя калецтвы для процьмы людзей, светагляд якіх атручаны шавіністычнай антычалавечай прапагандай.*

*Крэмль мусіць спыніць вайну, але сам на гэта не здольны. І калі цывілізаваны хрысціянскі свет (ці ёсць яшчэ такі?) не будзе дзеіць, маскоўска-гэбоўскі фашызм стане пагрозай для ўсяе Еўропы.*

**Уладзімір Хільмановіч**

## Вачыма еўрапейца

# Свой да свайго?



*Вельмі ж я задзівіўся, аглядаючы адзін з апошніх выпускаў „Аб'ектыва”, інфармацыйнай праграмы мясцовага тэлебачання. Вось, паказалі групу ультраправа-каталіцкай арганізацыі „Młodzież Wszechpolska” („Усяпольская моладзь”), якая сарганізавала ў Беластоку акцыю „Swój do swego po swoje”. Маладыя людзі развешвалі плакаты з гэтым лозунгам на выбраных сабою крамах, галоўным чынам прадуктовых, і ў шмат якіх выпадках невялікіх, прыватных. На такіх, якія палічылі за... польскія. Прытым намаўлялі да куплі польскіх вырабаў, значыць, зробленых у Польшчы з польскай сыравіны. Знеахвочвалі да набывання хлеба, сыру і падобных прадуктаў, прывожаных, для прыкладу, з Нямеччыны. Асталіся быць ласкавымі для „экзатычных”тавараў, значыць, чужых польскаму клімату і польскай зямлі, польскім фауне і флоры.*

*Прыгадвае мне гэта (вядомае з доўгаметражных і дакументальных фільмаў ды літаратуры) ангажаванне маладых нацыяналістаў у час нараджэння і росквіту фашысцкай Нямеччыны. Яны таксама памячалі выбраныя крамы і паслуговыя пункты, адно толькі што яўрэйскія — зоркай Давіда альбо выпісвалі на іх шыбах і мурах „Jude”. Як гэта закончылася, таксама ў краінах заваяваных гітлераўскай Нямеччынай, вядома. Ды пакіньма такія асацыяцыі. „Усяпольская моладзь” дзякуючы гэтай акцыі ўмяшалася ў права на свабоду гандлю, але і на свабоду выбару і вырашэнняў. Калі да гэтай пары выказвала яна толькі свае ідэі, можна было гэта прыняць да ведама, пагадзіцца, палемізаваць альбо ігнараваць. Цяпер спрабавала яна навязаць свае погляды, быццам бы прымусіць, нейкім відам націску, да байкоту хоць бы маёй знаёмай крамкі, у якой (адзінай у ваколіцы) магу сабе час ад часу купіць лазані прывезеныя з Берліна. Я (свой) хаджу ў сваю краму за тым, што добрае і таннейшае. Абслуга тут таксама свойская і заўсёды ветлівая. Не ведаю, чаму меў бы я вібіраць краму памечаную „Усяпольскай моладдзю”, дзе не мог бы купіць гэтых смачных лазаняў. Ці па гэтай прычыне я не патрыёт? Да таго — што ж гэта значыць: „свой да свайго”? Ці гэта не заклік: „Жыд да жыда”, „Паляк да паляка”. Чакаць толькі, што, тут як тут, пасля магчымага ўвядзення двухмоўных назваў у гмінах, дзе пражываюць у значнай колькасці нацмены, „Усяпольская моладзь” павывешвае плакаты „Беларусы на Беларусь!”, „Немцы ў Нямеччыну” і прыпомніць (о, якая жудасць): „Жыды на Мадагаскар!”. Цікава, як на тыя плакаты зрэагавалі ўласнікі крамаў і ўвогуле беластоцкія гандляры. Замест займацца задавальненнем патрэб кліентаў, заробкамі і ўтрыманнем сябе, сям'і ды сваіх работнікаў, мусілі б уключыцца ў дыскусію з палітычнай афарбоўкай, а не вядома ж, ці сарванне плаката арганізацыі блізкай сэрцу беластоцкіх уладароў не дасць у выніку нейкай паслядоўнасці іншага характару. Маю надзею, што з маёй непамечанай плакатам крамы не прападуць лазані, а пад націскам „Усяпольскай моладзі” абплакатаваная канкурэнцыя, што поруч, не пяройме яе кліентаў і не давядзе да яе ліквідацыі.*

*І яшчэ адно. Вядомы і шанаваны каталіцкі штомесячнік „Знак” апублікаваў тэкст Міхала Куркевіча „Зноў польска-беларускі канфлікт”, прысвечаны праверкам Дзяржкантролю (НІК) у „Ніве” і ў школах з беларускай мовай у Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы. Дайшоў ён да вываду, якім і я калісьці падзяліўся з дырэктарам беластоцкай дэлегатуры НІК Антоні Янухтам. Таму дазваляю прывесці словы рэдактара Куркевіча: „(...) уся справа падсылае беларускаму дыктатару аргументы, каб мог сказаць сваім падданым [польскай нацыянальнасці — М. Х.]: калі палякі хочуць памагаць вам, то чаму прыгнятаюць нашых суродзічаў на Беласточчыне. Можа таксама даць Аляксандру Лукашэнку „аргументы” для абгрунтоўвання чарговых зласлівасцей, а можа нават і рэпрэсій у адносінах да польскай стыхіі”. Гучыць гэта амаль як прароцтва, беручы пад увагу хоць бы факт, што ўжо праўрадавы мінскі дзённік „Советская Белоруссия” палічыў кантролі НІК і іх вынікі праявай дыскрымінацыі і заклікаў да шанавання ў Польшчы дэмакратычных каштоўнасцей, амаль як па прынцыпе „свой да свайго па сваё”.*

**Мацей Халадоўскі**

*Д. Банькоўскі: У паразуменні з Гарадской радай я наладзіў сустрэчу, у ходзе якой быў дасягнуты кансенсус, што на згаданых могілках маглі быць пахаваны і каталікі, і уніяты, і праваслаўныя. Мы прынялі абавязацельства забяспечыць пахаванне на кошт горада...*

# Браньскія астанкі

У Браньску ў другой палове 2004 года была праведзена мадэрнізацыя вулічнай інфраструктуры, у ходзе якой побач тамашняй царквы былі выкапаны людскія косці.

— На аснове гістарычных сведчанняў, м.інш. валочнай памеры, праведзенай у Браньску ў 1562-1563 гадах, вядома, што ў месцы раскопак былі ў 16-га стагоддзі праваслаўныя могілкі, — сказаў мне дырэктар Ваяводскай управы аховы гістарычных помнікаў Дарыюш Станкевіч. — Гэта непасрэднае суседства царквы, найстарэйшая частка горада з культурнымі напластаваннямі. На схіле 20-х гадоў 17-га стагоддзя Браньскі прыход далучыўся да Брэсцкай уніі. Да часу прускага панавання быў там пагост усходняга паходжання, які недалёка межаваў з прыкасцельнымі могілкамі, але ў метрыкальных кнігах у Драгічыне ёсць запісы, што на ім хавалі і каталікоў. У ходзе раскопак спярша выяўляліся адзіночныя пахаванні, а пасля іх лік перасягнуў за пяцьсот. Гэтыя астанкі мы рэкамендавалі перадаць настаяцелю праваслаўнага прыхода ў Малешах, які ахоплівае Браньск, для пахавання. Аднак браньскі каталіцкі пробашч заявіў, што пахаванні на згаданых могілках з'яўляюцца выключна каталіцкімі; мабыць, згодна лозунгу „Co unickie, to katolickie". Бурмістр Браньска запрапанаваў пахаваць выкапаныя астанкі ў гарадскім парку паміж царквою і касцёлам, дзе раней была частка могілак. Я згадзіўся, што гэта мае гістарычны сэнс, але запатрабаваў абгарадзіць месца і памясціць інфармацыйныя табліцы і рэлігійныя сімвалы.

— На дзень перад пахаваннем астанкаў, — сказаў мне бурмістр Браньска Данель Антоні Банькоўскі, — засцярогу наконт праваслаўнага пахавання астанкаў выказаў мне браньскі пробашч прэлат Раман Вадынскі. Я папрасіў настаяцеля праваслаўнага прыхода ў Малешах а. Георгія Харытанюка, каб спыніўся з гэтым пахаваннем; ён без агаворак згадзіўся. Я, у паразуменні з Гарадской радай, наладзіў сустрэчу, на якой прысутнічалі гісторыкі і духоўныя чыны абодвух бакоў. У ходзе гэтай сустрэчы быў дасягнуты кансенсус, што на згаданых могілках маглі быць пахаваны і каталікі, і уніяты, і праваслаўныя. Мы прынялі абавязацельства забяспечыць пахаванне на кошт горада, а канчатковыя абрадавыя рашэнні павінны прыняць іерархі.

— Я чуў, што пробашч не пагаджаецца на кампраміс...

— Пробашч не мае засцярог да выпрацаванага кансенсусу, — адказаў мне бурмістр Банькоўскі. — На месцы пахавання мяркуем паставіць тры крыжы, бо лічым такі крок карысным для горада — гэта павысіць яго гістарычную прыцягальнасць. Варта прыгадаць, што Браньск першым на Падляшшы атрымаў поўнае магдэбургскае права ў 1493 годзе.

***

Пратаколы Ваяводскай управы аховы гістарычных помнікаў у Беластоку наконт браньскай знаходкі паведамляюць, што могілкі пад сённяшняй вуліцай Пілсудскага (ранейшай Козяй) згадваюцца ў рэгістрах валочнай памеры, праведзенай у Браньскім старостве ў 1562-1563 гг. У ходзе восеньскіх раскопак — з 28 верасня па 15 кастрычніка — на абшары 310 квадратных метраў — да глыбіні аднаго метра — расследаваліся могілкі, датаваныя на схіл позняга Сярэдневякоўя (ад другой паловы 13-га да канца 15-га ст.) і Новага часу (ад канца 15-га да канца 18-га ст.), і ўстаноўлена, што там было пахавана 576 пакойнікаў. Зафіксаваны 123 цэлыя пахаванні з 137 асобамі ў розным узросце. Частка пахаванняў была знішчана ў час ранейшых пракладак гарадской інфраструктуры, м.інш. электрычнай і тэлефоннай ліній. Могілкі не мелі планамернага размеркавання на дарожкі з пахавальнымі ўчасткамі, не захаваліся таксама абрысы магільных ям. Амаль усе пахаванні былі ўздоўж восі ўсход-захад з галовамі памерлых скіраванымі ў заходнім напрамку. Захаваліся рэшткі драўніны і каваныя цвікі, што абазначае пахаванні ў трунах. Не захаваліся затое элементы адзення і рэлігійныя сімвалы; мабыць яны — гузікі ці крыжыкі — былі таксама драўляныя, што можа быць знакам беднасці пакойнікаў. Астанкі пачыналіся ўжо на глыбіні 0,25 метра — пад падсыпкай пад тратуарныя пліткі, а ад глыбіні 0,4 метра ў цёмна-бурым зямным пласце сустракалася вялікая колькасць людскіх касцей.

***

Апошняя канстатацыя — незвычайная мелкасць пахаванняў — схіляе да некаторай рэтраспекцыі, раскрываючай даволі — як мне здаецца — цікавую карціну. Бо ж нябожчыкаў хаваецца намнога глыбей, прынамсі паўтара метра ў зямлю. Якім жа чынам яны апынуліся так блізка паверхні; хіба ж не з-за іхняй беднасці?

Трэба меркаваць, што астанкі падышлі пад паверхню ў выніку супадзення некалькіх фактараў. Наогул месцы для пахаванняў закладваюцца на грудах з пясчаным ці супясчаным грунтам. У гарадах ці цэнтрах прыходаў могілкі закладваліся і пры цэрквах, якія таксама будаваліся на высокіх месцах. Няйначай, мабыць, было калісь — у сярэдневяковую даўніну — і ў закладзеным каля зліцця Нурца і Бронкі Браньску. З таго часу мінула шмат стагоддзяў, на нашай зямлі найбольш неспакойных на схіле Сярэдневякоўя і ў другой палове 17-га века, калі нашы паселішчы то руйнаваліся, то адбудоўваліся. У палове 16-га стагоддзя, калі каралева Бона купіла Браньскае войтаўства, па горадзе была пракладзена дарога акурат па месцы колішніх могілак, дзе цяпер былі адкрыты чалавечыя астанкі. І гэтая будаўнічая дзейнасць прыводзіла да нівеляцыі тых мяккіх пясчаных грудоў, з якіх пачыналася жыццё паселішча. Такім чынам паверхня грунту зніжалася; у Браньску яна знізілася недзе на метр, набліжаючыся да найстарэйшых пластоў пахаванняў.

Мяркую, што могілкі, праз якія ў палове 16-га стагоддзя пайшла дарога, ужо не прымалі паховін прынамсі стагоддзе. Значыць, тыя пахаванні, якія сёння залеглі пад самой падсыпкай тратуараў, трэба датаваць раней за палову 15-га стагоддзя. Сайт Драгічынскай дыяцэзіі паведамляе, што каталіцкая парафія ў Браньску была заснавана ў палове 15-га стагоддзя. Сталася гэта пасля таго калі Ягайла і ягоны сын Казімір адкрылі каталіцтву дарогу ў Вялікае княства Літоўскае. Да гэтага часу на Падляшша завітала праваслаўе. Шмат раней тут былі язычнікі, якія сваіх нябожчыкаў спальвалі не пакідаючы пасля іх касцей.

Энцыклапедычны даведнік „Народная культура Беларусі" паведамляе: „Праваслаўных хавалі звычайна галавой на захад, каталікоў — на ўсход"; гэта яшчэ адзін аргумент у карысць праваслаўнага паходжання браньскіх астанкаў. Цікава, чаму такая менавіта розніца ў пахавальнай пазіцыі гэтых дзвюх хрысціянскіх канфесій? Мяркую, што клалі іх так, каб яны ўстаўшы на Страшны суд станавіліся тварам або на ўсход — у напрамку Канстанцінопаля, або на захад — у напрамку Рыма.

Каля 1440 года Браньск, поруч з Драгічынам, Бельскам і Мельнікам, атрымаў магдэбургскае права на самакіраванне. Але тое права было частковае — ахоплівала толькі каталіцкіх гараджан; праваслаўныя гараджане аставаліся пад законамі феадальнага права. Згаданае бурмістрам Банькоўскім поўнае магдэбургскае права ахапіла і праваслаўных. Бельск такое права атрымаў у 1495 годзе, Драгічын — у 1498, Мельнік — у 1501, Нарва — у 1529. Той факт, што Браньск атрымаў яго — першым з падляшскіх гарадоў, з Пагоняй у гербе — 18 студзеня 1493 года з рук вялікага князя Аляксандра Ягайлавіча, сведчыць пра вялікую актыўнасць тадышніх браньскіх праваслаўных. Сёння ад іх нямнога асталося...

**Аляксандр Вярбіцкі**



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

## *Дарогі ў Сямятычах*

Ад некалькіх гадоў заўважаюцца станоўчыя змены на сямятыцкіх вуліцах. Горад узбагаціўся новымі тратуарамі, пракладзенымі з прымяненнем брускоў „полбрук”. На Славічынскай вуліцы, ад краю „Пасёлка бедных” (так у Сямятычах называюць квартал катэджаў) аж да вуліцы Славічай, спачатку паставілі вулічнае асвятленне, а зусім нядаўна праклалі новы ходнік, уключна з мастком на рэчцы Магамед. Гэтая інвестыцыя была неабходная, паколькі да гэтай пары пешаходы хадзілі па праезджай частцы дарогі, што было асабліва небяспечнае на неасветленым адрэзку ў лесе.

Вельмі патрэбным аказалася кругавое скрыжаванне вуліц Гродзенскай, Касцюшкі, Высокай, Гурнай і Славічынскай. Без кругавога руху выезд з навакольных вуліц быў надта складаны, асабліва ў базарныя дні. Цяпер з дарожным рухам у гэтым месцы няма ніякіх праблемаў. Плануецца будова другога кругавога скрыжавання дарогі з Беластока ў Люблін з шашой, якая вядзе з Варшавы ў напрамку Мельніка і дзяржаўнай мяжы.

Вядзецца таксама рамонт палатна вуліцы Цеханавецкай, якая вядзе ў напрамку Цеханоўца і Бельска. І хаця штораз больш бачна, што Сямятычам прыдалася б кальцавая дарога, то цяперашнія дарожныя інвестыцыі дазваляюць жыхарам лягчэй і больш бяспечна рухацца па горадзе ва ўмовах напружанага дарожнага руху. **М. Ц.**

## *Сённяшняя нармальнасць*

Цяпер на Гайнаўшчыне як і ва ўсёй Польшчы нормай стала беспрацоўе.

У Гайнаўскім павеце восенню бягучага года зарэгістравана 2 182 беспрацоўныя. 1 224 беспрацоўныя жывуць у Гайнаўцы і Кляшчэлях. У невялікіх Кляшчэлях беспрацоўных 39 чалавек, у Гайнаўцы — 1 185, што складае звыш 54% усіх беспрацоўных Гайнаўскага павета.

На сяле найбольшае беспрацоўе занатавана ў гмінах: Нараўка (9,7%), Чаромха (8,7%), Нарва (7,4%), Гайнаўка (6,5%) і Белавежа (5,1%). Найменш беспрацоўнага люду ў гмінах Дубічы-Царкоўныя (2%), Чыжы (2,1%), Кляшчэлі (2,4%). Сярод беспрацоўных 54% гэта жанчыны. 30 працэнтаў беспрацоўных складаюць людзі з падставовай адукацыяй, 28 працэнтаў гэта выпускнікі рамесных школ. Не мае працы на Гайнаўшчыне 6,6% асоб з вышэйшай адукацыяй і 8,7% выпускнікоў агульнаадукацыйных ліцэяў. Што астаецца рабіць маладым беспрацоўным у ІІІ Рэчы Паспалітай? Урад рэкамендуе пільна вывучаць англійскую мову і падавацца шукаць шчасця і долі ў багатых заходніх краінах Еўрасаюза.

**Мікалай Варанецкі**

# Ці трэба пагранпераход?




*Многа сумненняў наконт мэтазгоднасці адкрыцця пагранперахода мелі Іаанна Трафімюк (стаіць) і астатнія гайнаўскія белліцэісты*

Сустрэча на тэму „Белавежская пушча — супольная адказнасць”, арганізаваная 24 лістапада Павятовым староствам і польскім аддзяленнем Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF Польшча) у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы ператварылася ў дыскусію наконт планаванага на наступны год адкрыцця пагранперахода побач Белавежы.

Вялікі лозунг „Дзікае прыгожае” павесіла Таварыства аховы краявідаў, якое выступае супраць адкрыцця турыстычнага перахода і змагаецца за суцэльную ахову Белавежскай пушчы. У петыцыі накіраванай у Міністэрства аховы асяроддзя маладыя члены таварыства просяць не адчыняць пагранперахода ў сярэдзіне пушчы. Іх прапановы падтрымлівае WWF Польшча, якое стала суарганізатарам спаткання з мясцовым грамадствам наконт аховы пушчы. Іншым суарганізатарам рашыліся быць павятовыя ўлады, якія разам з гміннымі самаўрадамі Гайнаўшчыны хадайнічалі за адкрыццё пагранічнага перахода. Сярод сабраных былі прыхільнікі пешаходнага і веласіпеднага перахода побач Белавежы і асобы, якія змагаюцца за адмяненне такога рашэння. Адчувалася, што гэтых апошніх прыйшло больш. Амаль усе асобы, якія выступалі спачатку спаткання, крытыкавалі рашэнне ў справе арганізавання турыстычнага пагранперахода. Белліцэісты выступалі як прыхільнікі суцэльнай аховы пушчы і былі супраць нішчэння лесу дзеля будовы пагранічных будынкаў. Пыталі таксама наконт магчымасцей арганізаваць экскурсіі па Белавежскай пушчы ў Беларусі. Музейны бібліятэкар Наталля Герасімюк паінфармавала, што зараз беларускія ўлады не дазваляюць арганізаваць экскурсій па пушчы. Вязуць толькі ў некалькі турыстычных месцаў і госцям з-за мяжы застаецца наведваць мясцовасці распалажаныя вакол пушчы. Валянціна Горбач з Павятовага староства ў Гайнаўцы паінфармавала, што з адкрыццём перахода будуць стварацца большыя магчымасці турыстычнага наведвання пушчы ў Беларусі. Стараста Уладзімір Пятрочук сказаў, што ёсць магчымасць стварэння трансгранічных турыстычных шляхоў па Белавежскай пушчы і побач яе з адной інфармацыйнай сістэмай.

Перад адкрываннем пагранперахода перасцерагалі жыхары Чаромхі. Яны адмоўна ацанілі дзейнасць пагранічнага перахода побач сваёй мясцовасці. Звярталі ўвагу на малыя фінансавыя карысці ад прыезду турыстаў з-за ўсходняй мяжы. Прыхільнікі адкрывання пагранперахода паінфармавалі, што звыш 20 гадоў мясцовыя ўлады выступалі да вышэйшых улад з прапановамі арганізавання турыстычнага перахода побач Белавежы. Амаль палову тэрыторыі перададзенай на патрэбу пагранперахода будзе складаць дарожная паласа (каля 0,4 гектара). Знішчэнне лесу на апошняй тэрыторыі будзе абмежаванае да дрэў, якія будуць перашкаджаць будове памяшканняў. Алесь Палескі з Гайнаўкі гаварыў, што намнога больш трэба апасацца знішчэння пушчы ў час планаванага пашырэння асфальтавай дарогі з Гайнаўкі ў Белавежу. Сабраныя не выпрацавалі супольных рашэнняў у справе прадбачанага на наступны год адкрыцця пагранперахода.

Міхал Голуб з Гайнаўкі запрапанаваў заняцца іншымі праблемамі, якія тычацца Белавежскай пушчы. Паінфармаваў ён, што жыхары прыпушчанскіх вёсак наракаюць на складанасці з купляй дроў. На працу ў пушчы, у многіх месцах, перасталі браць мясцовых жыхароў, а прывозяць рабочых з іншых рэгіёнаў Польшчы. Працаўнікі Дзяржаўных лясоў тлумачылі, што зараз нават Брусель мусяць яны інфармаваць аб аўкцыёнах на вылучэнне прадпрыемстваў, якія будуць займацца ляснымі работамі. Калі нават прадпрыемствы з іншых краін запрапануюць добрыя і танныя паслугі, то замежнікі будуць працаваць у пушчы. Апошнім часам выдатна паменшала колькасць дрэў, якія можна за год высякаць на тэрыторыі Дзяржаўных лясоў Белавежскай пушчы. Меншае таксама колькасць дабраякаснай драўніны, што прадаецца ў надлясніцтвах. Аднак з двухтыднёвым папярэджаннем можна купляць меншкалярыйныя дровы.

Віктар Кабац крытыкаваў лясную гаспадарку ў Дзяржаўных лясах, звяртаючы ўвагу на непатрэбную высечку лесу. У час спаткання паявілася прапановы абмежавання вывазу драўніны па-за Гайнаўскі павет і памяншэння колькасці высечаных дрэў. Аднак для такога вырашэння справы патрэбныя асобныя сеймавыя пастановы па ахове Белавежскай пушчы. Дзеля абмежавання аўтамабільнага транспарту і лепшай аховы пушчы прапанавалася вярнуць чыгуначны транспарт з Гайнаўкі ў Белавежу. Зараз мясцовыя самаўрады выступілі ў Дзяржаўную чыгунку з просьбай перадаць чыгуначныя пуці і шукаюць спонсараў для рэалізацыі такой задумы. Намеснік старшыні Рады Гайнаўскага павета Мікола Яноўскі крытыкаваў улады Белавежскага нацыянальнага парку за дрэннае гаспадаранне ляснымі палянамі і недастатковае падкормліванне лясной жывёлы. Прапанаваў ён абкошваць паляны і сенам карміць лясную звярыну, якая зараз нішчыць збожжа ў гаспадароў пражываючых побач лесу. Выдатная большасць сабраных разышлася незадаволеная палітыкай польскага ўрада і лясных улад у адносінах да гаспадарання ў Белавежскай пушчы. Адны лічаць, што трэба намнога лепш ахоўваць лес. Другія незадаволеныя абмежаваннем высечкі дрэў, высокімі цэнамі на лясную сыравіну і складаным доступам да высакаякаснай драўніны.

**Аляксей Мароз**

## *Злачыннасць*

*У канцы верасня на чыгуначным пуці, непадалёк ад гайнаўскага вакзала, знайшлі забітага мужчыну. Гэтае здарэнне выклікала ў Гайнаўцы дыскусію наконт росту злачыннасці ў горадзе і хуліганскіх паводзін моладзі. Гэтую тэму абмяркоўвалі таксама павятовыя і гарадскія радныя.*

*Старшыня Рады горада Гайнаўка Якуб Астапчук прадставіў радным інфармацыю аб крымінальнай злачыннасці ў Гайнаўцы. У першым паўгоддзі гэтага года — у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года — з 7 на 13 павялічыўся лік разбояў, якія нанеслі ўрон здароўю, з 5 на 16 — рэгістраваных паліцыяй боек, з 1 на 2 гвалтаў, з 15 на 25 выступленняў супраць паліцыянтаў, з 6 на 12 здарэнняў наркаманіі. Сярод малалетніх таксама пабольшала з 5 на 10 колькасць здарэнняў наркаманіі.*

*— Ёсць шлях з Варшавы, якім прывозяцца наркотыкі. Ёсць у горадзе дылеры, якія іх распаўсюджваюць, — заявіў старшыня Якуб Астапчук. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паведаміў аб магчымасці ўстанаўлення тэлекамер у найбольш небяспечных месцах Гайнаўкі. Аднак паліцыя патрабуе некалькіх штатаў для работнікаў, якія адсочвалі б здарэнні ў горадзе.*

*Паявілася нават ідэя прыняцця звароту радных у справе вяртання кары смерці за самую цяжкую злачыннасць. Аднак гэтая ідэя сустрэлася з крытыкай.*

*— Стаянка перад гарадскім магістратам у вольныя ад працы дні ператвараецца ў бар пад адкрытым небам. Пад'язджаюць дзве або тры машыны і моладзь робіць стол. Паводзіны маладых людзей вечарам не даюць пачуцця бяспекі, — сказаў стараста Уладзімір Пятрочук. Радныя гаварылі аб гонках, якія арганізуюцца на гайнаўскіх вуліцах і агрэсіўных паводзінах моладзі вечарам і ноччу побач магазінаў. Прапанавалі яны выступіць да паліцыі з просьбай аб больш актыўнае процідзеянне злачыннасці. Паявілася нават прапанова звярнуцца за дапамогай да беластоцкай паліцыі.*

**(ам-з)**

# Быць беларусам у Польшчы

Сёлета пачалася мая вышэйшая адукацыя. Вывучаю стаматалогію на Беластоцкай Медыцынскай акадэміі. На адным курсе са мной штудзіруе больш за сотню людзей. Я была ўпэўнена, што сустрэну тут каго-небудзь „сваёга”, з кім можна было б прынамсі паразмаўляць на гаворцы, а можа нават паўспамінаць белліцэй. Атрымалася аднак па-другому. Няма нікога „сваёга”. Адна дзяўчына, праваслаўная, з Беластока (напэўна ёсць іх болей — выявяцца ў час Калядаў, альбо і не выявяцца...). Адзін украінец, эмігрант з усходняй Украіны, зусім спаланізаваны, украінскую мову вывучае ад мяне. Адна дзяўчына евангелічнага веравызнання, з літоўскімі каранямі — свайго дзядулю, калі ён размаўляе на роднай мове, не разумее. Астатнія, мабыць, палякі. Мабыць, добрыя палякі і добрыя каталікі. З усяе Польшчы.



Фота БАГУСЛАВА СКОКА

**Пошукі сваіх**

У Гайнаўскім беларускім ліцэі не трэба было шукаць сваіх. Не было проста ніякіх „чужых”. Усе мы былі насамрэч аднолькавыя, хаця некаторыя лічылі сябе тутэйшымі, іншыя праваслаўнымі палякамі, частка беларусамі, а астатнім было „усё раўно”. А тут? Тут таксама ведаю, хто ёсць хто, але гэта таму, што ад самага пачатку даследую, „правяраю” людзей. Чытаю на калідорах кніжкі па-беларуску. Часам выпадкова, часам, нібыта выпадкова, гавару нешта па-свойму. Такім чынам мае сябры ведаюць напэўна, што я — беларуска. Гэта заўсёды так файна сказаць паляку: „Я — беларус”. І чалавек сябе адчувае нонканфармістам і мае магчымасць усведаміць людзям, што ў іх краіне жывуць яшчэ іншыя нацыі.

**Але як гэта сказаць?**

„Я — беларус з Польшчы. Я не эмігрант. Мае продкі жылі заўсёды тут, дзе жыву я цяпер. Справа ў тым, што мы гаворым на іншай мове, ходзім у іншую царкву, што самі лічым сябе іншымі. Мы — нацыянальная меншасць. Як сілезцы ў Сілезіі”. Ці гэта дастаткова ясна сказана? Мне здавалася, што так.

**Пытанні**

Такім чынам ствараю своеасаблівую экзотыку. Чую пытанні накont аранжавай рэвалюцыі ва Украіне: „Ці гэта праўда, што беларусы не любяць украінцаў?” — „А як у вас людзі рэагуюць?” Тады магу з радасцю адказаць, што ў маім горадзе, на афіцыйнай сустрэчы са старостам, шмат хто апранаў аранжавыя стужкі (ідэя Таварыства аховы краявіду).

Але што маю адказаць, калі блізкая, здаецца, сяброўка, з Падкарпацця, пытаецца ў мяне, якім чынам я штудзірую ў Польшчы. Ці трэба мне плаціць за адукацыю? Не трэба? Ці ў мяне падвойнае грамадзянства? Нагадваю ёй: „Я — не эмігрант. Мае продкі жылі заўсёды тут...” А яна працягвае: „А якое грамадзянства ў тваіх бацькоў?”

**Няхай іх, палякаў!**

Ды няхай іх, палякаў, няхай прывыкаюць, няхай пытаюцца, няхай нават не да канца разумеюць, чаму я наогул кажу, што я іншая, калі яны ж бачаць, што я такая, як яны — не чорная, не зялёная — а звычайная. І па-польску гаварыць умею. Няхай бы і сабе думалі, што я з іх проста жартую, бо не дасца ж не быць палякам, калі чалавек нарадзіўся і жыве ў Польшчы... Такіх рэакцый можна спадзявацца.

Больш нечаканае сустрэла мяне з боку „сваіх”. Нават не стараючыся, знайшла я сукватарантку якраз з Бельска-Падляшскага. Праўда, не з белліцэя, але ў пачатковай школе вывучала яна беларускую мову. А яе найлепшая сяброўка закончыла белліцэй. Абедзве яны цяпер на трэцім курсе медыцыны. Аднойчы, калі я рыхтавала сабе вячэру, вярнуліся яны з заняткаў і сяброўка адразу пачала:

— Ты то мусіш любіць той рускі.

Я, нейк непрытомна глянула на пліту — там морква са слівамі і мёдам, каша. Аўтарскі праект. Ніякі рускі. Не ведаю ў чым справа. Філасафічна адказваю:

— Рускага то не. Беларускі люблю.

Тая працягвае:

— І сцяг тут такі маеш... Ведаю, бел-чырвона-белы, памятаю з матуры. То і кажу — мусіш любіць той рускі...

— Гэта ж беларускі сцяг. Рускага я б не вешала.

— І музыку такую слухаеш... То і сабе думаю — мусіш любіць той рускі...

З майго пакоя чувац „Плач Ерэміі”.

— Музыка якраз не руская, а ўкраінская, — можа не зусім ветліва адказваю ёй.

— Я там не ведаю. Калі на дыскатэцы ляцiць такая музыка, то можна патанчыць, але так то не слухаю рускай... А ты то мусіш любіць той рускі...

Ды што яна прычапілася? Адказваю нарэшце:

— Мушу, вядома, што мушу. Як не любіць беларускага, калі чалавек сябе лічыць беларусам? Я ж невыпадкова пайшла ў беларускі ліцэй...

— Уааааў! А я выпадкова! І што, ты — сапраўды беларуска?

— Ну так.

— Уааааааў! А шмат у цябе беларускіх продкаў?

З радаснай усмешкай адказваю:

— Усе!

— Оооооо...

Падабаецца мне яе шчырае зацікаўленне. Тым болей падабаецца, што нашы бабулі жывуць у гэтым самым сяле. Тым болей, што абедзве маем за сабой чатыры гады адукацыі ў белліцэях. Атрымліваецца так анекдатычна, што трэба гэта запісаць.

Калі белліцэісты не могуць паверыць у існаванне беларусаў Польшчы, я перастаю верыць у прадбачлівасць. Чужы становіцца сваім, свой робіцца чужым, а артыкулы не маюць завяршэння.

**Зося Лемеш**

## Каму паскардзіцца?

Аб тым, што Прадпрыемства рэгіянальных чыгуначных перавозаў у Беластоку неакуратна ставіцца да падарожных, прыкладаў хоць адбаўляй.

28 лістапада, у нядзелю, падарожнічаў я ў Гайнаўку а $6^{28}$. Замест рэйкавага аўтобуса, які курсіруе ў рабочыя дні, былі падстаўлены два вагоны з лакаматывам. У іх падарожнічала не больш дваццаці-трыццаці пасажыраў (на амаль 200 месц). Як паясніла кіраўнік поезда, састаў такі курсіруе адно ў нядзелю (???). Стаўлю затым пытанне: — Чаму б не памяняць саставы — у рабочыя дні пастаўляць два вагоны, а ў нядзелю рэйкавы аўтобус?

З снежня (пятніца) вяртаўся я з Гайнаўкі рэйкавым аўтобусам а $15^{55}$. Пасажыраў, а так бывае ў кожны рабочы дзень як у бочцы селядцоў. Кандуктар не мог варухнуцца, прапускаў пасажыраў у вагончык, праверыўшы білет на пероне. Замест 52-56 асоб сціскалася каля 120-130 пасажыраў. У час язды аўтобусам кідала (пры хуткасці 70 км/гадз.) на ўсе бакі быццам каробкай запалак. Людзі баяліся, што вагон выскачыць з рэек. Каго затым вінаваціць за такі беспарадак? На маю думку, віноўны перавозчык, г.зн. Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку, які не гарантаваў належнага транспарту. Непасрэдна за праезд пасажыраў адказныя кіраўнік поезда і машыніст. Яны не павінны дапускаць да язды перапоўненага ўдвая поезда. Але гэтыя знаходзяцца паміж молатам і кавадлам. Адмаўленне язды раўназначнае з самагубствам. Людзі зглумілі б іх на пероне. Мне здаецца, што справай павінны пацікавіцца органы правапарадку, паколькі перапоўненыя ўдвая вагоны ствараюць пагрозу аварыі рэйкавага аўтобуса і пагражаюць жыццю пасажыраў. Ці станем шукаць віноўных, калі здарыцца трагедыя і загінуць людзі? Гэтае пытанне стаўлю дырэктару рэгіянальных перавозаў у Беластоку.

**Уладзімір Сідарук**

## Выстаўкі

*Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42, запрашае на выставы:*

***Шляхам Янкі Купалы і Якуба Коласа** — фотавыстава прысвечаная жыццю і творчасці класікаў беларускай літаратуры;*

***Пазнаёмімся з Беларуссю** — выстава лепшых паштовак са збораў Адама Чурака;*

***Выстава разьбы па дрэву Міхала Коца з Гайнаўкі**;*

***Перш чым хлеб паклалі на стол** і **Дзень за днём** — пастаянныя этнаграфічныя выставы.*

*Усе вышэйзгаданыя выставы працуюць да канца гэтага года.* **(мох)**

## Вясковыя гарадскія

*Сакрат Яновіч наракае, што мала хто размаўляе на беларускай мове, а я думаю, што людзі ўвогуле паміж сабою не хочуць размаўляць, нават на дзяржаўнай мове. Сам я не ведаю як размаўляць з нашымі дзяўчатамі, якія імкнуцца быць trendy, страшэнна на вачах панеюць. Пабачыш такую дзеўку з суседняй вёскі, прысядзешся побач у аўтобусе і нават не спробуеш загаварыць па-свойму, бо яна сароміцца, што мо нехта з пасажыраў папракне яе і назаве wieśniarą.*

*Пайстаюць як грыбы пасля дажджу ўсялякія арганізацыі, у тым ліку і нашыя, якіх мэта — зберагаць родную мову, а ў гарадскіх абуджаць настальгію па мове дзядоў. Ад пару гадоў хаджу на сустрэчы брацтва пры царкве св. Мікалая. Кожную сераду праваслаўных студэнтаў сустракаюць айцы Уладзімір Місіюк і Марк Ваўранюк. Першы працягвае сямейную традыцыю захавання беларускасці і часта са студэнтамі размаўляе на вясковай гаворцы, другі — таксама прывучае маладых малітве. Думаю, што гэта нядрэнная ініцыятыва яднаць людзей адной веры. Пасля маладыя сустракаюцца ў кавярнях, гуляюць на беларускіх ды ўкраінскіх імпрэзах, пазнаюць сябе бліжэй, яднаюцца...*

*Хаця мой English слабы, але я ўпэўнены, што мовы трэба ведаць, каб пазнаваць цікавых людзей. Таму вучыцеся людзі не толькі чужой мове, але і роднай, вынесенай з „Нівай”, якую куплялі дзяды ды бацькі, з роднай песняй, якую трэба спяваць пад гітару на вогнішчах і не саромецца размаўляць пры чужых па-свойму.*

*Аднойчы ў інтэрнаце на імпрэзе сабралася шмат польскіх сяброў. Навокал гучала польская мова, усе спявалі пад гітару польскія і замежныя песні. Па нейкім часе мы абодва пачалі спяваць свае вясковыя прыпеўкі. Адзін з нашых польскіх сяброў сказаў нам: „Chłopaki, to bomba! Wy swój język udoskonaljcie na płytach czy kasetach i przekażcie następnym pokoleniom!” Пасля гэтага некалькі дзяўчат пачало падспяваць „Тры чарапахі”, хтосьці іншы пачаў расказваць як цудоўна гуляў на Купаллі, іншы яго ляпнуў па-сяброўску па плячу: „У Белавежы? Там мая бабуля жыве!” Мы з сябрам пачулі, што мы не самі. Даўно я не быў на так добрай сяброўскай сустрэчы і кажу вам, паверце мне, свойскасць заўжды ў модзе!*

**Юрка Буйнюк**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

*а. Андрэй Беразавец*

## *Зіма*

*Зіма белаю рукою*
*Снегам сыпнула на хаты,*
*А мароз гэтай парою*
*Ходзіць гнеўны, барадаты.*

*На акне рысуе кветкі,*
*То між зоркамі гуляе —*
*Хай баяцца яго дзеткі,*
*Што ён усіх перамагае.*

*Гудзе, трэскае дратамі,*
*Шчыпле ўсіх за нос і рукі.*
*Ён валодае начамі,*
*Чуваць усюды яго гукі.*

*Снег скрыпучы пад нагамі*
*Раскідае дзетвара.*
*З горкі хуткімі санкамі*
*Струменіцца гамарня.*

*Завіруха, скрып палоззя,*
*Снег пушысты як пярына —*
*Каб дзяцей хоць не змарозіў,*
*Бо ім гэта беганіна*
*Возьме ночы палавіну.*

*Так, ад рання да змяркання*
*Перапынку, брат, няма.*
*Дзеткі нават без снядання*
*Там, дзе снежная гара.*
*Дык на гэта ж ёсць зіма!*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Навучэнцы беларускай мовы з VI кл. Пачатковай школы н-р 4 у Беластоку*

# Праверылі, ці разумныя

Яшчэ нядаўна да прадметнага конкурсу беларускай мовы прыступалі адны арлы! Зараз пайшла мода на масавае ўдзельніцтва ў конкурсе. Для амбітных вучняў гэта выклік. Астатнім — нагода праверыць свае веды і магчымасці.

У беластоцкай „чацвёрцы” да конкурсу прыступілі амаль усе пяцікласнікі і шасцікласнікі. Вось, якія ўражанні вучняў шостага класа.

**Юліта Жамойда:**

— Я хацела праверыць свае веды па граматыцы. Мяне вельмі цікавілі тэмы, якія выступяць у конкурсе. Задачы былі і лёгкія, і цяжкія. Найбольш запамяталася мне чацвёртая задача — у слове *сл...ва* трэба было ўставіць літары так, каб атрымаліся тры розныя вынікі: *слава, сліва, слова*. Гэты конкурс многаму мяне навучыў.

**Оля Каліна:**

— Я задаволеная вынікамі нашага класа. Для мяне не было загадкавых пытанняў — словам, конкурс не быў цяжкі. Цяжка, аднак, было ашукаць шаноўнае журы, якое не спускала з нас вока і сачыла за кожным падазроным рухам. Маю надзею, што ў наступным годзе конкурсныя пытанні апрацуе наша настаўніца.

Віншую дзяўчат і хлопцаў, якія перайшлі школьны этап!

**Оля Паўлючук:**

— У мяне было вельмі многа памылак, задачы трэба было чытаць уважліва і я тут правалілася. Якая была ў мяне матывіроўка? Хацелася атрымаць добрую ацэнку па беларускай мове. Цяпер я ведаю, якія ў мяне памылкі.

**Наталля Кандрацюк-Свярубская:**

— Я ўжо другі раз прымала ўдзел у прадметным конкурсе па беларускай мове. Год таму конкурс быў просты, амаль усе ўдзельнікі перайшлі першы этап. Зараз было інакш. Карацей, задачы не былі найпрасцейшымі. Ды многія пытанні скрывалі ў сабе нейкую загвоздку, трэба было чытаць усё ўважна і пасля падумаць. Мне пашанцавала перайсці ў далейшы этап. Мне будзе там сумна (бо не будзе з кім жартаваць і смяяцца з хлопцаў!).

Я сама хацела б прыдумаць такі прадметны конкурс. Толькі ў мяне ўжо за сам удзел былі б якасныя ўзнагароды!

**Эмілька Мусько:**

— Мяне цікавіла ўдзельніцтва ў конкурсе, я хацела праверыць сябе ды настрой, які гэты конкурс выкліча. Здавалася, не будзе цяжка. У час конкурсу панаваў прыемны настрой, нас пільнавала файная камісія, спадарыні Аліна і Валянціна.

Думаю, што ў гімназіі я таксама прыступлю да конкурсу па беларускай мове.

Шаноўная камісія — мы хочам, каб наступны конкурс быў *тэстам!*

**Кася Юшчук:**

— Я хацела праверыць свае веды і магчымасці. Выявілася, што год раней было лягчэй, але і так варта было!

**Аляксандр Ваўранюк:**

— Мая мама — настаўніца беларускай мовы і ў мяне не было як выкрунуцца ад удзелу. Я ведаў, што маю шанц перамагчы!

**Мацек Карчэўскі:**

— Я хацеў праверыць, ці я не такі ўжо дурны?! Мне не падабалася, што дзяўчаты гаварылі паміж сабой. Тэст быў нялёгкі, а мой вынік не найгоршы! Значыць, ёсць як думаў. Пры нагодзе я даведаўся, што няма такога слова *гадзь* (мне здавалася, што такі мужчынскі род ад слова „гадзюка”.

**Мацвей Севастыянік:**

— Я хацеў праверыць свае веды і выявілася, што я не арол па беларускай мове. Крыху перашкодзілі дзяўчаты, якія многа пляткавалі...

**Алекс Мазурук:**

— Чаму прымаў удзел у конкурсе? Тут няма сумненняў — я проста мудры!

Калі мы пісалі, мне захацелася спаць. Ёсць падазрэнне, што прыкончыла нас канкурэнцыя, якая яшчэ на перапынку частавала амаль усіх цукеркамі. Раённая пракуратура ў Сямятычах пачала следства ў гэтай справе. Высветлілася, што цукеркі мелі наркатычныя якасці. Цяпер вядома, чаму я не перайшоў у другі этап (гэта, вядома, жарт, але інакш не магу зразумець сваёй паразы)!

* * *

Адзначым, што пяць асоб перайшло на далейшы этап: пяцікласнікі — Ганна Пякарская, Тамаш Максімюк, Яраслаў Якацюк ды шасцікласнікі — Наталля Кандрацюк-Свярубская і Аляксандр Ваўранюк.

Зорка

Час рыцараў

## Зброя і мода

Разам з развіццём ваеннай тэхнікі мянялася і рыцарская зброя. У палове XII стагоддзя ваяр апранаўся ў туніку за калена. На скураны кафтан накідаў плашч з жалезных кольцаў — кальчугу. Галаву зберагаў конусападобны шлем, ногі — цяжкія чаравікі.

У XIII стагоддзі памянялася мода. Туніку апраналі на верх кальчугі. Такім чынам адзенне не іржавела ў час дажджоў і не парыла ў спёку. Шлем асланяў усю галаву рыцара.

Праз сто гадоў мода зноў памянялася. Зброя стала цяжэйшай і больш каларытнай. Папоўнілася яна шматлікімі металічнымі асlonамі на грудзі, плечы, ногі. А ўжо ў XV стагоддзі рыцар стаў „закуты” з галавы па ногі. Такая зброя не была зручнай, жалезны камплект ваяра важыў больш-менш чвэрць цэнтнера (25 кілаграмаў). У бліскучай зброі рыцар выглядаў быццам іншапланецянін! *Зорка*

## Маё месца

Маё найпрыгажэйшае месца — лес, што расце нападалёк маёй хаты. У ім многа вялікіх, прыгожых дрэў. Калі прыходзіць восень і ападае лістоўе, усё пакрываецца каляровым дыванам. У гэты час я прыходжу сюды збіраць грыбы ды падыхаць чыстым паветрам. Калі хачу адпачыць ад школьных праблем або ў мяне дрэнны настрой, іду туды, каб пасядзець ля старога дуба, які расце ад соцень гадоў.

*Малгося Прычыніч, Тарнопаль*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Школьнікі з Новага Корніна

## Казка пра светлячка

Даўным-даўно рос сабе вялікі магутны лес. Быў ён домам шматлікім звярам, насякомым і зусім маленькім стварэнням. У лесе пражывалі і светлячкі.

Светлячкі жылі ў маленькіх доміках. Яны адрозніваліся тым, што вечарамі толькі ў іх вокнах было відаць святло. І калі лес ахінала цемра, светлячкі запальвалі свае лямпачкі ды цешыліся святлом у сваіх хатах.

Аднойчы адзін маленькі і вельмі цікаўны светлячок пайшоў гуляць у лес. Загледзеўшыся на прыгожую лясную прыроду і заслухаўшыся ў спеў птушак, ён не прыкмеціў, калі ў лесе стала цёмна, панура і страшна. Светлячок хуценька дастаў сваю лямпу і, асвятляючы сабе дарогу, стаў накіроўвацца дамоў. Тады пачуў голас: „Пачакай, не ідзі так хутка!” Светлячок азірнуўся і ўбачыў мурашку. „Я шукала сабе адпаведную саломку для нашага мурашніка, працавала і нават не заўважыла, як зрабілася цёмна. Прашу цябе, дапамажы і мне, асвятляючы сваім святлом дарогу”, — папрасіла мурашка. Светлячок выслухаў і згадзіўся. Калі асвятляў дарогу сабе і мурашцы, стала яму вельмі радасна на душы. Заўсёды так бывае, калі мы дапамагаем іншым.

Вярнуўшыся дамоў, светлячок заўважыў, што іншыя светлячкі пакрыўдзіліся на яго за тое, што ў яго хаце не было святла. Яны непакоіліся таксама, куды ён прапаў. Мурашка сказала аб дапамозе смелага светлячка і з усёй душы падзякавала яму за гэта. Пасля яна знікла ў сваім мурашніку.

Выслухаўшы ўсю гісторыю, светлячкі задумаліся. З гэтай пары яны ўжо вечарамі не асвятляюць сваіх хатак, а ходзяць па лесе і рассвятляюць дарогу ўсім патрабуючым.

*Анна Садоўская*

## Вершы Віктара Шведа

### Песімісты

*Размаўляюць гімназісты,*
*Што няма ў жыцці раскошы,*
*І што нам у песімістаў*
*Пазычаць прыйдзецца грошы.*

*Песімісты жыць не ўмеюць,*
*З песімізму няма выйсця,*
*І няма у іх надзеі*
*Што доўг звернем ім калісьці.*

### Запалкамі не трэба забаўляцца

*— Запалкамі, сынок,*
*Не трэба забаўляцца.*
*Бацька зрабіў намёк —*
*Павінен сын баяцца.*

*А раптам сын на здзіў*
*Уцёр татульку носа:*
*— Я толькі прыкурыў*
*Запалкай папяросу.*

## Навука і адпачынак

Гэта была ўзнагарода за працу над праектам „Янка-Музыкант”, у якім мы займаліся гісторыяй сваіх вёсак.

20-21 кастрычніка г.г. некаторыя вучні трэціх класаў Нараўчанскай гімназіі пабывалі на біваку ў Белавежы. Мы наведалі Прыродазнаўчы музей і выстаўку пушчанскіх звяроў, глядзелі фільм пра Белавежскую пушчу. Хадзілі таксама ў Інстытут даследавання млекакормячых і ў месцы, у якіх леснікі даследуюць жыццё лесу. Начавалі мы ў „Папарацi”, як і ў пушчы быць павінна. Усім гэтая экскурсія вельмі падабалася. Варта было ажыццяўляць наш праект, бо мы многа даведаліся пра свае вёскі, а прытым знакаміта адпачылі, нягледзячы на тое, што ночы ў такіх выпадках заўсёды вельмі кароткія.

*Эмілія Каральчук, III клас Гімназіі ў Нараўцы*

## Польска-беларуская крыжаванка № 51

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Jucha | Humor | | | | | | Gama | | Nabój | |
| | | | Przód | Otawa | | Mysz | Grzęda | | | | |
| | Hol / Śmiech | Paszport / Wiara | | | | | | | | | Jeleń |
| Świat | | | | | Nagroda | | Arka | | | | |
| Miara | | | | | | | Do (nuta) / Nos | | | | |
| | | | | | | | | | | | |
| Kon-fesja | | | | | | | | | | | |
| | Chód | | | Pościel | | | | | | | |

**Адказ на крыжаванку н-р 47**: Соска, бародка, бык, ляля, сабака, балада, лоб, бал, асоба. Прабабка, рыба, сокал, код, каша, склад, Кая, ало, Об, сяліба.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Юліта Кананюк** і **Анна Порац** з Нарвы, **Марлена Ляшчынская** з Гайнаўкі, **Анна Селеванюк** з Бельска-Падляшскага, **Паўліна Паскробка, Паўліна Паўлючук, Дарота Цімашук** і **Эля Анджаеўская** з Дубін, **Юліта Скепка** і **Якуб Сухадола** з Нараўкі, **Павел Чурак** з Арэшкава.

## Вясёлы куточак

Дзедка даў унучцы крыху грошай. Маці глядзіць на гэта і падказвае:

— Вазьмі і падзякуй дзедку, Кася!

— А што мне сказаць?

— Скажы тое, што мама кажа тату, калі ён аддае ёй зарплату.

— Чаму так мала? — кажа малая дзедку.

*Даслаў Андрэй Гаўрылюк*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дэкламатаркі з Гарадка

# Ад аднаго каня да аднае каровы

Вёска Скраблякі сёння нагадвае грыб, што засеў між лесу здалёк ад сучаснасці. Іду туды жвіроўкаю, што асталася сярод сарака-пяцідзесяцігадовага лесу, ад Баброўніцкай шашы, ад вёскі Вераб'і. Скраблякі трымаюцца яшчэ на саступаючай лесу паляне. Перад вёскай загон збожжа, абведзены плотам з дроту, на якім развешаны ўсялякія прадметы акустычнага прызначэння — ад бляшаных банак з-пад напояў да вялікіх плахтаў тканіны і фольгі — дзеля адпужвання няпрошаных лясных аматараў земляробных смакоццяў. Побач дрэмле адзінокая карова, крыху далей — загончык агарода. Перад першымі хатамі цэментны крыж, змацаваны зверху жалезным вобадам, з надпісам: „Силою Креста Твоего сохрони и помилуй наше отчество Господи, 8го ноябр. Сей крестъ сооружен дер. Скребляковъ 1911 года".

Летам, у перыяд канікул, відаць у вёсцы адзнакі жыцця. На першым



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вясковая вуліца



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж перад Скраблякамі

панадворку гаспадарацъ маладыя людзі, мабыць гарадскія выхадцы адсюль. Праехаў трактар. Каля будынка, які здаецца быць колішняй школай, невялікі рамонтны рух. На адным панадворку бачу на лавачцы двое старэнькіх людзей, заходжу да іх. Панадворак дбайна скошаны — відаць, што гарадскія дзеці старых вясковых гаспадароў не забываюць пра сваіх дзевяностагадовых бацькоў. Жанчыне цяжка ўжо гаварыць, абяссілена яна ўжо гадамі, затое ж мужчына шпаркa і ахвотна расказвае пра вясковае мінулае.

У бежанства выехала ўся вёска, а будынкі рускае войска спаліла датла. Калі ў 1918 годзе бежанцы сталі вяртацца ў родныя Скраблякі, капалі зямлянкі з адным аконным праёмам. На ўсю вёску толькі адзін конь быў. А неўзабаве, у 1920 годзе зноў нахлынула вайна. Рускія заходзілі каб чайку папіць. А калі наступалі палякі, у іх можна было дастаць і хлеб, і муку. Палякі разбувалі бальшавікоў і тыя босыя па марозе хадзілі. Я гэта бачыў, бо наша сям'я ў той час некалькі гадоў жыла ў Каралёвым Мосце, дзе бацька працаваў дарожным сторажам.

У міжваенны перыяд школа была ў Вераб'ях; туды прыходзіла вучыць прыватная настаўніца з Грыбаўцоў. Багацейшыя бацькі, што маглі адзець і абуць сваіх дзяцей, пасылалі іх у тую школу. А я не вучыўся, і ўсе мае калегі непісьменныя былі.

У 1939 годзе прыйшлі саветы, гаварылі „Мы вас асвабадзім", спявалі песні, „Кацюшу". І нашы таксама насаджвалі чырвоныя паскі на рукавы і хадзілі з лозунгамі ў Гарадок спяваць. Старэйшыя, што раней у Расіі ў духоўных школах вучыліся, пісалі тыя лозунгі.

З нашай вёскі ў ссылку нікога не вывезлі, але ўжо спіскі для дэпартацыі былі складзены, толькі не ўспелі; дзве каровы маеш, то ўжо кулак. Палова вёскі запісалася ў калгас.

Пад нямецкай акупацыяй у нас ціха было, але партызаны прыходзілі. На прымусовыя работы забралі бадай пяць дзяўчат, з якіх адна вярнулася, а апошнія павыходзілі замуж. А хлопцы ўцякалі ў лес, а каго немец злавіў, таго гнаў з сабою на поезд у Валілы-Станцыю.

Пасля вайны некалькі сем'яў са Скраблякоў выехала ў Савецкі Саюз, пасяліліся там недалёка. А я не паехаў: навошта мне ехаць, кідаць свой куток, якой бяды шукаць? А хто мне там што рыхтаваў?

Цяпер у Скраблякаx толькі старыя дажываюць. На ўсю вёску толькі адна карова і адзін конь. І некалькі свіней дужэйшыя сяляне трымаюць. Кругом зямлю забралі і лесам абсадзілі. Аб'язныя крамы прыязджаюць два-тры разы ў тыдзень. Пастаяннай крамы ніколі ў нас не было, ездзілі за восем кіламетраў у Гарадок, або бліжэй, у Лужаны, як там калгас быў. І я быў калісь у Лужанах працаваў, блёкі стаўляў, аўчарню...

За Скраблякамі распасціраецца яшчэ крыху поля. Больш аблагоў, але і тыя ўжо нікому непатрэбныя, бо няма чаго на іх пасвіць. На зямлі, да якой чалавек страціў цікавасць, адбываецца аўтаномнае міжраслiннае змаганне за быт. Яшчэ трымаецца пустазелле, цвітуць кветкі, але і вырастаюць больш стойкія хвоечкі. Нашы зялёныя лёгкія набіраюць сілу.

**Аляксандр Вярбіцкі**



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Аблог за Скраблякамі зарастае сасновым самасеем

## Што ўбіў — то і ўехаў!

*У школе ў Гарадку адкрылі ізбу традыцыі. Слава арганізатарам! У краіне якраз мода на такія праекты і Гарадок не хацеў быць горшым.*

*Гарадоцкая ізба традыцыі — гэта гісторыя школы. З 1945 года па сучаснасць. Фатаграфіі, школьныя прылады, вучнёўскія касцюмы і мундзіры гарцэраў. Тры пакаленні пасляваенных часоў у моры польскай культуры.*

*Як выглядае тут беларускае пытанне?*

*Гэтае пытанне павінен паставіць кожны прытомны чалавек. Калі ідзеш вуліцамі мястэчка ці заглянеш у краму, ступіш на базарык — усюды па-просту! Беларускасць тут стыхійная і каларытная. Ды і ў ацэнцы сталічных чыноўнікаў — школа таксама не такая ўжо польская! Міністэрства адукацыі сфінансавала, на сродкі для беларускай нацыянальнай меншасці, рамонт школы, канкрэтна — новыя вокны ў школе. Самой гміне не пад сілу было б сфінансаваць такую інвестыцыю — аднак чыноўнікі не робяць нічога, каб пашырыць навучанне беларускай мовы. Жахлівы прыклад тут — школа ў Залуках, якую разам з настаўніцай роднай мовы (пайшла на пенсію) вывелі са школы.*

*У школе ў Гарадку калі ўсе свае — настаўнікі размаўляюць па-просту (не ўсе маюць адвагу назваць свой дыялект беларускай мовай). Ды і пазіцыя простай мовы — падпольная. Хопіць, каб у кампанію далучыўся адзін паляк або чыноўнік (у мундзіры) — нацыянальная стыхія, нібыта мыльная бурбалка, расплываецца ў паветры. Наш просты інтэлігент аўтаматычна пяройдзе на польскую мову і будзе гаварыць „як трэба", значыць, па-польску.*

*Але нешта мяняецца ў карысць адраджэння беларускай мовы. У артыстычнай частцы, якая папярэдзіла адкрыццё ізбы традыцыі, трэцюю частку складаў беларускі рэпертуар. На ўсякі выпадак тут прыдумалі бяспечную дыстанцыю — беларускае слова і песню прадставілі як беспаваротную спадчыну дзядоў. Быццам мінула і капец — ужо не вернецца. Можна толькі гаварыць, успамінаць...*

*Тады як глядзець на „Басовішча", на беларускія гурты, якія дзейнічаюць пры Гарадоцкім доме культуры („РІМА", „Прымакі"), на дзесяткі маладых хлапцоў і дзяўчат, якія трасуць беластоцкім БАСам, урэшце на беларускую мову, якая выкладаецца ў школе і гімназіі?*

*У царкоўных кругах моладзь таксама сімпатызуе беларускасці.*

*— Калі мы едзем на якую экскурсію ці ладзім сваю імпрэзу, маладыя спяваюць выключна па-нашаму, — кажа айцец Мікалай Астапчук. — Я нават здзіўляюся, — працягвае бацюшка, — адкуль яны ведаюць усе гэтыя песні.*

*Нельга сказаць, што ў ізбе традыцыі няма беларускіх элементаў — яны ёсць, аднак, старанна прыхаваныя. Можна адшукаць іх у фотаальбомах або школьных хроніках. Агульны вобраз ізбы як мае быць — папраўна польскі.*

*Калі ўпамінаю, што мала тут беларускіх матываў, чую дыпламатычны адказ:*

*— Экспазіцыю мы будзем мяняць. Напэўна беларускія акцэнты ў нас былі і будуць, — кажа Вера Тарасэвіч, шматгадовая дырэктарка ПШ.*

*Сціпла выглядае навучанне беларускай мовы. На ўрокі ходзіць кожны пяты вучань. Не надта стабільная сітуацыя беларускай залы — нібыта ёсць кабінет — аднак няма ў ім партаў і ўрокі праводзяцца ў розных класах. На калідоры дарэмна шукаць беларускай насценгазеты ці нацыянальных сімвалаў меншасці (праваслаўных відавочная большасць).*

*І, здаецца, у Гарадку нічога не зменіцца, калі не будзе загаду звонку. Дарэчы, такая сітуацыя амаль у кожнай т.зв. меншаснай школе. Большасць рэгіянальных ізбаў і музеяў — гэта не самастойная ідэя настаўнікаў, толькі патрэба часу ды адукацыйных праграм. Шчасце, калі рэалізаваць яе стане інтэлігентны настаўнік і нешта з усяго зразумее...*

*Бо першай праблемай, якая кранае беларускую меншасць — гэта асіміляцыя саміх настаўнікаў. Многія паводзяць сябе так, быццам справа нацыянальнага гонару іх не датычыла.*

*Шчасце, што ў школу час ад часу прыходзяць добрыя для нас ідэі і праграмы. Тады мусова брацца і за беларускасць...*

*Адным словам — што ўбіў, то і ўехаў!*

**Ганна Кандрацюк**

# Мая душа пранікнута Бібліяй

— Мая прыгода з паэзіяй, — кажа а. Андрэй Беразавец, — пачалася ў пачатковай школе — недзе ў пятым-шостым класе. Тады я „зарабіў” за вершы дзве двойкі; настаўніца думала, што я гэтыя свае вершы спісаў ад Міцкевіча.

У школе было нас траіх хлопцаў, што сталі пісаць вершы. З іх толькі я прадаўжаю літаратурную працу, а яны — адным з іх мой брат Янка — прыціхлі.

Калі я вучыўся ў Духоўнай акадэміі ў Варшаве, прымкнуў да беларускага культурна-мастацкага руху. Тады інструктарам Варшаўскага аддзела БГКТ на Сенатарскай быў Віктар Швед. Таварыства звярнулася ў нашу Акадэмію, каб мы запісаліся ў беларускі хор. І нас — самых студэнтаў Духоўнай акадэміі — запісалася каля дваццаці пяці маладых мужчын з добрымі галасамі. Да таго ж мы прымалі ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах на Сенатарскай, куды прыходзіла многа студэнтаў, выхадцаў з Беласточчыны.



*На літаратурным семінары ў Беластоку 1 кастрычніка 1961 года. Злева направа: Андрэй Беразавец, Сяргей Ільяшук, Віктар Швед, Яша Бурш, Алесь Барскі, Алесь Свісёк, Ян Беразавец, Ян Чыквін*

Калі я закончыў Акадэмію, я яшчэ душпастырскай працай не заняўся, бо не быў жанаты. Было мне тады дваццаць чатыры гады. У такіх абставінах Віктар Швед зарэкамендаваў мяне ў Гайнаўскі аддзел Таварыства — на радзіму, бо сам я родам з Лапухоўкі, што ў Нарваўскай гміне. На працу кіравалі мяне Лідзія Бялецкая і Канстанцін Майсеня.

У Гайнаўскім аддзеле працаваў я тры гады. Ладзілі сходы, фэсты, арганізавалі канцэрты „Лявонізі”. Трэба было ездзіць у гмінныя ўстановы або школы. Бывала, што трэба было задаволіць неардынарныя патрабаванні артыстаў, напрыклад, Каліноўскі патрабаваў перад канцэртам напіцца паранага малака, бо гэта паводле яго добра настройвала голас. Аднойчы, у мароз, ехалі мы з „Лявоніхай” у Мора і трэба было заехаць у Збуч, каб адагрэцца! То там Люба Томчык і Вольга Сянкевіч на печ залезлі, каб ногі адагрэць...

У Гайнаўцы ведалі, што я закончыў Духоўную акадэмію і тамашнія партыйныя лідэры — Самоцік і Казбярук — націскалі мяне, каб я запісаўся ў партыю. Размовы доўжыліся гадзінамі і мне давялося патраціць шмат нерваў ад іх. Урэшце яны спасавалі, але з агаворкай: „Ідзі ў Царкву, але ўводзь туды ўсё чырвонае”; значыць, каб я быў святаром невеpуючым!

Ажаніўшыся, стаў я на душпастырскую працу. Служыў у прыходах Бранева, Гурова-Ілавецкае з Лідзбаркам-Вармінскім і Барташыцамі. Адтуль вярнуўся на Беласточчыну, у Паўночны Востраў, дзе служыў сем гадоў.

— Ці ў той час існавала яшчэ там нейкая спадчына пасля Ільі Клімовіча?

— Можна сказаць, што ўжо нічога з ягонай спадчыны тады не асталося. Жыло там некалькі жанчын, да якіх прыязджаў нейкі чалавек з Крынак. З Сакольшчыны я трапіў на кароткі час у Заблудаў, а адтуль ужо ў Беласток — на Выгоду і ў Старасельцы. Год быў у Нью-Йорку, а з 1990 года я ў прыходзе Святога Духа на Антонюку.

— І ў які час Вы займаліся творчай працай на ніве паэзіі?

— Бывала па-рознаму: у залежнасці ад абставін, ад людзей, ад месца. Тэму выношваю ў сабе і калі даспее, тады хутка пішацца. Праз два дні праверка твора і яго завяршэнне.

— Ці можаце назваць сваіх паэтычных куміраў?

— З самага пачатку палюбіў Пушкіна, пасля Ясеніна і, вядома, Купалу і Коласа. Захаплялі мяне Гётэ, Лермантаў, крыху Байран, а з польскіх Славацкі і Фрэдра.

— І хіба цар Давід, бо апрача калядак і батлеек ёсць у Вас і творы псаломнага характару?

— Безумоўна, бо мая душа пранікнута Бібліяй. І большасць маёй творчасці прысвечана духоўнай тэматыцы. Шмат працую над містэрыямі. Пішу па-беларуску, па-польску, па-руску.

Першым маім вершам, друкаваным у „Ніве”, была „Жаніцьба”. Апрача вершаў друкаваліся і іншыя празатарскія матэрыялы. У творчай і арганізатарскай працы я атрымаў вялікую дапамогу перш за ўсё ад Віктара Шведа і Міхася Хмялеўскага. У той час у беларускім літаратурным аб’яднанні працаваў сённяшні ўладыка Лодзінскі і Познаньскі Сіман, які быў адным з рэцэнзентаў маёй партызанскай п’есы „Чужыя людзі”.

Мой першы аўтарскі вечар адбыўся ў Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі ў Варшаве, на якім прысутнічалі тагачасны мітрапаліт Васілій і сённяшні — Сава. Быў, вядома, Віктар Швед і яшчэ шмат-хто. Былі аўтарскія вечары ў Гайнаўцы і Бельску. У мінулым годзе такое мерапрыемства адбылося ў беластоцкім Цэнтры праваслаўнай культуры, дзе я чытаў свае творы ў музычным суправаджэнні нашага прыхадскога маладзёжнага хору пад кіраўніцтвам Багдана Пуры.

Выйшлі дзве мае кніжкі: „W świetle Gwiazdy Betlejemskiej” і „W drodze do Betlejem”. Маю ўжо таксама сабраны матэрыял і для трэцяй кнігі.

— Можа займаецеся перакладамі?

— Не было часу. Апрача службы на прыходзе працую ў школе і калі вяртаюся дадому, то хочацца крыху памаўчаць. Матэрыялу для творчасці не бракуе, абы толькі быў час. А спяшацца трэба, бо дні хутка ўцякаюць...

**Аляксандр Вярбіцкі**

**Андрэй Беразавец**

### *Сон*

*На зямельку цень лягае,*
*Ночанька прыходзіць,*
*А Марыя Прачыстая*
*Бога-Дзетку родзіць.*
*Беспрасветнаю зімою,*
*Там дзе ветры ходзяць*
*І хвілінай часта злою*
*Духі пекла бродзяць.*
*Як жа страшна за Дзіцятка*
*Сярод дзікай ночы,*
*Каб маленькі свету Збаўца*
*Не заплакаў вочы.*
*Спі, маленькае Дзіцятка,*
*Сні пра ўсё прыгожа,*
*Каб усім на цэлым свеце*
*Было добра, Божа.*

### *Хлопцы*

*Месяц круглы над вярбою*
*Ў сажалцы смяецца*
*Што Валодзя са Сцяпанам*
*За Марусю б’ецца.*
*Ой вы хлопцы-дзяруны,*
*Усе будуць смяяцца —*
*Як жа можна у адну*
*Двaім закахацца.*
*Колькі дзевак ёсць на свеце —*
*Вам нават не сніцца,*
*А за добру і прыгожу*
*Трэба памаліцца.*

# *Сустрэча з паэзіяй Віктара Шведа*

9 лістапада г.г. у Падставовай школе н-р 47 імя Клеменса Браніцкага ў Беластоку адбылася сустрэча з беларускім паэтам Віктарам Шведам, якой арганізатарам былі настаўнікі-бібліятэкары гэтай школы.

У сустрэчы прынялі ўдзел вучні, дырэктарка школы Галіна Гапунік, настаўнікі, а таксама запрошаныя вучні з настаўнікамі-бібліятэкарамі Падставовых школ н-р 19 і 37 ды Комплексу інтэграцыйных школ н-р 1 і Публічнай гімназіі н-р 15.

Мэтай сустрэчы было азнаямленне з паэтычнымі дасягненнямі Віктара Шведа, які ў 2005 годзе будзе адзначаць 80-гадовы юбілей.

На пачатак урачыстасці гаспадары пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчасцю паэта. З творчымі дасягненнямі знаёміла таксама выстаўка ўсіх выданняў В. Шведа.

Падчас сустрэчы адбыўся Міжшкольны конкурс паэзіі В. Шведа, у якім прынялі ўдзел вучні пяці названых школ, вылучаныя ва ўнутрышкольных элімінацыях.

Журы састаўлялі аўтар вершаў і настаўнікі-бібліятэкары. Вучні прадставілі шырокі дыяпазон паэтычнай творчасці Віктара Шведа. Лаўрэатамі конкурсу сталі: Пётр Гаўрылюк — ПШ н-р 19, Эвеліна Эйсмонт — ПШ н-р 37, Патрыцыя Масціцкая — ПШ н-р 47, Анна Нямыйская — Комплекс інтэграцыйных школ н-р 1 і Малгажата Гузэль — Публічная гімназія н-р 15.



Выступіў таксама Віктар Швед, які расказаў аб сваім жыцці і паэтычнай творчасці. Асаблівую ўвагу звярнуў ён на дзіцячыя гады і пачаткі сваёй літаратурнай дарогі. Чытаў ён таксама свае вершы. Вучні паставілі паэту шмат пытанняў.

Пасля заканчэння мерапрыемства яго ўдзельнікі выстраіліся ў чаргу за кніжкамі з аўтографамі паэта. Сустрэча была надзвычай карыснай і разбудзіла паэтычныя зацікаўленні дзяцей і моладзі.

**Аліна Бароўская, Ежы Яшчук, настаўнікі ПШ н-р 47 імя Клеменса Браніцкага ў Беластоку**

*Матывы сівой даўніны маюць падвойнае значэнне. З аднаго боку прыемна слухаць добрую музыку і песні, а з другога — чалавек далучаецца да слаўнай гісторыі Беларусі...*

# http://staryolsa.com

Як кажуць, новае — гэта добра забытае старое. Часцяком не толькі старыя, але і старадаўнія песні ў сучаснай апрацоўцы, якія гучаць зусім няблага. Матывы сівой даўніны ў беларускай сучаснасці маюць падвойнае значэнне. З аднаго боку прыемна слухаць добрую музыку і песні, а з другога — чалавек далучаецца да слаўнай гісторыі Беларусі, адчувае подых вякоў, становіцца бліжэй да народных традыцый, якія, на жаль, апошнім часам, не знаходзяць годнага адлюстравання ў штодзённым жыцці.

Адным з носьбітаў такога духоўнага адраджэння можна назваць гурт „Стары Ольса". І з гэтай нагоды варта наведаць ягоны сайт.

Набраўшы на сваім камп'ютэры адрас у Інтэрнэце http://staryolsa.com, перад нашымі вачыма адкрыецца арыгінальнае карычневае выяўленне сярэднявечнай гравюры, дзе намаляваны іграючы на гуслях чалавек. Зверху і знізу — назоў вышэйзгаданага гурту напісаны кірыліцай і лацінкай. У левым ніжнім вугле малюнка — надпіс па-англійску, па-расійску і па-беларуску, які азначае толькі адно — „Уваход". З гэтага вынікае, што сайт трохмоўны.

Увайшоўшы, мы аказваемся на старонцы „Навіны". Але папросту навінnай гэту рубрыку не назавеш, бо сярод інфармацыі аб меўшых месца падзеях падаюцца і анонсы. Зразумела, што тычацца яны выступленняў гурту ў бліжэйшай будучыні.

Побач своеасаблівай стужкі навін месяцца выхады да іншых рубрык сайта. І наступная — „Дасье". Менавіта ў гэтай рубрыцы ёсць магчымасць грунтоўна пазнаёміцца з рэдкім у Беларусі гуртом, які выконвае нацыянальную сярэднявечную музыку. Тут ёсць тры падрубрыкі — „Гісторыя", „Склад" і „Творчая біяграфія". З першай мы можам больш даведацца аб крыху дзіўнай назве гурту. Аказваецца Ольса — гэта ручай у заходняй частцы Магілёўскай вобласці. У гурт музыкі аб'ядналіся пяць гадоў таму. Колькасна іх нямнога — усяго пяцёра. Партрэтны здымак кожнага маецца ў настунай падрубрыцы. А „Творчая біяграфія" распавядае аб розных канцэртах, што мелі месца з удзелам „Старога Ольсы" цягам апошніх гадоў.

Наступная рубрыка „Музыка", ці як яна называецца па адкрыцці — „Альбомы". У ёй размешчаныя выяўленні кампакт-дыскаў, запісаных гуртом за час свайго існавання. З гэтай старонкі можам зразумець, што музыкі сваёй духоўнай спадчынай лічаць менавіта Вялікае княства Літоўскае.

Старонка „Інструменты" распавядае аб тых музычных інструментах, на якіх іграюць у „Старым Ольсе". Практычна да кожнага расповеду даецца фотаздымак.

У рубрыцы „Танцоры" мы можам пазнаёміцца з гуртом „Яварына", які працуе ў сімбіёзе з „ольсамі". Як падаецца на сайце — гэты гурт з'яўляецца іх неад'емнай часткай.

Паглядзець фотаздымкі з „ольсаўскіх" канцэртаў магчыма ў аднайменнай рубрыцы. Старонка „Відэа", відаць, да канца яшчэ недапрацаваная. Каб убачыць запісаныя відэакліпы, трэба мець у камп'ютэры адмысловую праграму. Ды і кліпаў усяго два. Затое песні можна паслухаць, маючы толькі галаснікі.

Калі звярнуцца да той мэты, якую ставіць у сваёй творчасці гурт, а гэта — „найбольш поўная (па магчымасці) рэканструкцыя музычных традыцый Вялікага княства Літоўскага, асноўнай культурнай і геапалітычнай часткай якога ў 13-18 стагоддзях была Беларусь", то яна музыкамі амаль дасягнута.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Адной з галоўных прычын „перабору" легіянераў у расійскіх камандах стаў працяглы лакаўт у заакіянскай Нацыянальнай хакейнай лізе...*

# Беларусь, беларусы...

**Хакеісты ў „дзіравым" законе**

Скандал з атрыманнем беларускімі хакеістамі пашпартоў грамадзян Расійскай Федэрацыі атрымаў шырокі розгалас. Усяго ў расійскай суперлізе выступаюць зараз 9 беларускіх гульцоў. Частка з іх — Сяргей Шабанаў („Металург", Новакузнецк), Дзмітры Панкоў („Салават Юлаеў", Уфа), Андрэй Скабелка („Сібір", Новасібірск), Канстанцін Кальцоў („Спартак", Масква), Уладзімір Цыплакоў (ЦСКА, Масква) засталіся легіянерамі. Іншыя ж — Аляксей Калюжны („Авангард", Омск), Руслан Салей („Ак Барс", Казань), Міхал Грабоўскі („Нафтахімік", Ніжнекамск), Андрэй Мезін (СКА, Санкт-Пецярбург) зараз прыналежаць невядома да якой краіны. З нядаўняй пары ў расійскім чэмпіянаце быў прыняты ліміт на легіянераў. Але ў гэтай краіне традыцыйна любяць падманваць як міжнародную грамадскасць, так і саміх сябе. У экстранным парадку вялікай колькасці легіянераў (у іх ліку не толькі пералічаныя беларусы, але і 7 украінцаў, ажно 18 казахаў і нават па аднаму прадстаўніку Эстоніі і Канады) былі выраблены адпаведныя дакументы. Нібыта, фармальна, усё паводле закону, а па-сутнасці — самападман. Бо сапраўднай мэтай ліміту на іншаземных хакеістаў ёсць даць мажлівасць гуляць сваім маладым выхаванцам. Сваіх жа талентаў у Расіі зараз моцна бракуе (прыкладам асноўныя галкіперы амаль усе з-за мяжы).

Адной з галоўных прычын „перабору" легіянераў у расійскіх камандах стаў працяглы лакаўт у заакіянскай Нацыянальнай хакейнай лізе. Майстры экстра-класа хлынулі ў дастаткова моцныя еўрапейскія чэмпіянаты. Сярод іх беларусы Кальцоў (ён належыць клубу „Пітсбург пінгвінз") і Салей („Анахайм магці дагз"). У Расію прыехаў нават знакаміты чэх Ярамір Ягр — зараз ён гуляе ў адным звяне з нашым Калюжным. Беларусы — „новыя рускія" — як адзін цвердзяць пра недарэчнасць сітуацыі, заяўляючы, што і надалей гатовыя бараніць гонар зборнай Беларусі. Але што скажуць у такой сітуацыі кіраўнікі міжнародных хакейных структураў — невядома.

Заканадаўчыя дачыненні паміж Расіяй і Беларуссю ў межах так званай „саюзнай дзяржавы" дастаткова заблытаныя. Пэўныя прававыя моманты можна „выкруціць" у які заўгодна бок. Сёння выглядае на тое, што падвойнае грамадзянства (абсурд палягае ў тым, што ні ў Расіі, ні ў Беларусі яно не дазволена) не будзе замінаць нашай чацвёрцы выступаць за сваю нацыянальную дружыну. Але на гэта могуць выказаць прэтэнзіі расійскія клубы. І тады ўсё будзе залежаць ад патрыятычнай паставы кожнага хакеіста.

А адкрыты чэмпіянат Беларусі ў самым разгары. У ім прадказальна дамінуюць мінскія „Юнацтва" і „Керамін". Трэцім трымаецца кіеўскі „Сокал". Змаганне, што ішло паміж „Рыгай" і гродзенскім „Нёманам" за запаветнае восьмае месца, якое дазволіць трапіць у плэй-оф, падобна развязалася ў асабістай сустрэчы. Латвійскія хакеісты перамаглі ў гасцях з лікам 2:1 і апярэджваюць „Нёман" ажно на 9 пунктаў. Хаця гуляць яшчэ доўга (да лютага будучага года) турнірная табліца і стан клубаў характарызуюцца пэўнасцю. Іншымі ўдзельнікамі плей-оф чэмпіянату вельмі імаверна стануць магілёўскае „Хімвалакно", ліепайскі „Металургс", наваполацкі „Хімік-СКА" і „Гомель".

**Уладзімір Хільмановіч**

# Шахматы ў Беларусі



http://bychess.narod.ru/nn/

***Вітаю вас, шаноўныя калегі!***

Па-першае, запрашаю на неафіцыйную старонку „Каісы" ў „Нашай Ніве" (http://bychess.narod.ru/nn). У рубрыцы „Каіса" імкнуся па меры магчымасцей асвятляць падзеі шахматнага жыцця краіны і замежжа. Тэксты размешчаны на добрым, „раскручаным" сайце „Шахматы ў Беларусі", які, трэба меркаваць, не застанецца па-за ўвагай сп. Лапцэвіча.

Па-другое, мне цікава было прачытаць матэрыял майго цёзкі Хільмановіча „Пад знакам Каісы" ў „Ніве" ад 7.11.2004 г. На жаль, трапляюцца тамака сякія-такія недакладнасці. Віктар Купрэйчык быў чэмпіёнам Беларусі два разы (у 1972 г., як правільна адзначыў аўтар, і ў 2003 г.), а Вячаслаў Дыдышка заваёўваў тытул чэмпіёна не восем, а аж дзесяць разоў (гл. http://www.chess.by/Chempion.html). Сярод вядомых шахматыстаў, што цяпер жывуць у Беларусі, сп. Хільмановіч называе Аляксея Суэціна, які ўжо памёр. Дый імя гросмайстра Аляксандрава не Аляксандр, а Аляксей.

Да гістарычных нататак хацелася б дадаць, што, па версіі беларуска-шведскага даследчыка А. Катлярчука (гл. яго даследаванне „Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў") акурат вікінгі прынеслі шахматы на беларускія землі. Адна з ранніх пісьмовых згадак пра ўмельства беларускіх шахматыстаў пакінута памеранскім падарожнікам Паўлам Одэрборнам, які ў XVI ст. наведаў Полачыну і напісаў у кніжцы „Праўдзівае грунтоўнае апісанне Русінаў": „У шахматах яны [палачане] такія майстры, што не ведаю, ці зможа які іншы народ зраўняцца з імі ў гульні!" (цытуецца паводле Г. Сагановіча).

Мне цяжка пагадзіцца з тым, што апошнім часам беларускія шахматысты выступаюць „не вельмі ўдала". 18-е месца ў мужчын і 27-е ў жанчын на Сусветнай алімпіядзе ў іспанскай Кальвіі — гэта, хутчэй, поспех, зважаючы на тое, што ў Алімпіядзе выступіла каля сотні каманд. У 2003 г. Сяргей Азараў стаў віцэ-чэмпіёнам свету ва ўзросце да 20 гадоў, а Сяргей Жыгалка — чэмпіёнам Еўропы і свету да 14 гадоў. Так што, нягледзячы на цяжкасці з фінансаваннем, брак турніраў міжнароднага маштабу ў Беларусі, нашы гульцы (усё яшчэ) здольныя на многае.

Калі хтосьці з чытачоў „Нівы" напіша пра тое, як развіваюцца шахматы ў Польшчы, у прыватнасці, наколькі яны папулярныя ў беларускіх асяродках — буду рады. Дарэчы, у 2005 г. „Каіса" плануе арганізаваць завочную партыю гросмайстра з чытачамі „Нашай Нівы". Спадзяюся, беластоцкія аматары, што маюць доступ у Інтэрнэт, далучацца таксама. Як палітолаг, магу аўтарытэтна заявіць: найлепшай партыяй ёсць партыя ў шахматы.

Адрас для ўсіх заўваг, пытанняў і прапаноў: rubinchyk@lycos.com.

З павагай,

**Уладзімір (Вольф) Рубінчык — вядучы рубрыкі „Каіса"**

**Да юбілею Гайнаўскага беларускага ліцэя**

# Мае ўдачы і няўдачы



### Кантакты з бацькамі

А вяртаючыся яшчэ раз да пакрыўджаных у свой час Валодзькаў, хачу сказаць, што пасля даволі доўгага перапынку я сустрэўся з імі на з'ездзе выпускнікоў. Абодва яны выраслі на сапраўдных, фізічна здаровых мужчын, здабылі добрыя прафесіі, працавалі на адказных і добра платных пасадах. Відаць, цялеснае пакаранне ў вучнёўскія гады ім не пашкодзіла. А можа памагло?!

Пакрыўджаны мною Валодзька працаваў над перавыхоўваннем злачынцаў і крымінальнікаў.

Я запытаў яго:

— Ты помніш як я пакрыўдзіў цябе?

— А як жа, — адказаў ён.

— Крыўдуеш на мяне? — пытаю.

— Што вы? Я на гэта заслужыў і такое пакаранне чагосьці навучыла мяне. З дзяцінства мяне ніхто не біў і мне пачало здавацца, што ўсё мне можна. А тут аказалася, што не ўсё — і гэта было мне патрэбна.

— А што, скажы, было б, каб я, дапусцім, цяпер трапіў да твайго „пердэлька"? — далей пытаю.

— Стараўся б дапамагчы вам, але лепей не трапляйце да нас...

І камень спаў мне з сэрца.

Я вельмі любіў сустракацца з бацькамі сваіх вучняў, а найболып на бацькоўскіх сходах, званых „вывядоўкамі" ў нас. Ой, які гэта быў цікавы, прасталінейны народ. Цяпер ужо зусім не тое. І калі, бывала, сумееш падысці да іх і выклікаць іх на шчырасць, вось дзе наслухаешся цікавых спраў. Мне гэта часта ўдавалася. Думаю, дапамагала ў гэтым тое, што ніколі не звяртаўся я да іх на „общепринятой", а яны выказваліся на ўсіх сваіх гаворках. Любата.

З бацькамі нашых вучняў стараўся я жыць, адным словам, у блізкіх, партнёрскіх адносінах. Яны са мной таксама. Не раз бывала проста на вуліцы падыходзіць да мяне кабеціна ці мужчына і — як у нас кажуць — „падзеньдабрыкаецца" і пытае: „Як там паводзіць сябе і вучыцца мой Толік, Жоржык ці Гандзя?" Не падаючы нават прозвішча вучня.

І добра, калі ведаеш пра каго ходзіць. Горш калі не ведаеш. Дапытвацца як бы не выпадае, бо калі ім здаецца, што ты павінен ведаць, то як жа ж і не ведаць? Вось і гаворыш больш-менш так, што амаль да кожнага дапасаваць можна: замнога не пахваліш, але і не наганіш.

У адказ пачуеш: „Ой, то спасібо вам. І нэ цэрэмоньтэся з ім (ёю): і накрычыэтэ на його, і укарайтэ, калі трэба, мы будэм туолькі ўдячны вам. Ім позвуоль туолько, то і на голову ўлізут..."

Такі спосаб кантактаў з бацькамі таксама апраўдваў сябе, але маглі быць тут і няўдачы.

Аднойчы, напрыканцы навучальнага года, сустракае мяне добра падвыпіты мужчына. Ён быў маім крыху знаёмым і мы з ім заўсёды сардэчна віталіся, але ні яго імя, ні прозвішча, ні, тым больш, таго, што ён мае дачку і гэтая дачка вучыцца ў нас, я не ведаў. І пытае: „Скажы мне як вучыцца мая дачка?"

Не жадаючы зрабіць прыкрасці п'янаму чалавеку тым, што дасюль не ведаю яго дачкі і не пацікавіўся як вучыцца яна, я і пачаў асцярожненька:

— Ты ведаеш, някепска, стараецца яна.

Тады ён ужо са злосцю:

— То чом вы, ёб вашу мать, нэ пэрэвэлі іе?!

Сучасная школа — гэта не толькі надзьмутыя настаўнікі, напужаныя і пакорненькія вучні, дысцыпліна, безупынная зубрэнне ўрокаў, кантрольныя работы, экзамены... Але і мноства школьных мерапрыемстваў, урачыстасцей, весялосці, смеху, камічных сітуацый... Гэта школа жыцця...

**Васіль Сакоўскі**

# Супольнае ў фальклоры і традыцыі

Мастацкімі выступленнямі і спартыўнымі спаборніцтвамі, якія адбыліся ў кастрычніку ў Гайнаўцы, закончылася рэалізацыя польска-беларускага праекта „Крыніцы сяброўства. Пошукі супольных сцежак у фальклоры і традыцыі". Мерапрыемства арганізаванае было Гайнаўскім домам культуры, у рамках Еўрарэгіёна „Белавежская пушча".

Рэалізацыя праекта, фінансаванага „Нацыянальнай праграмай для Польшчы" і гарадскім бюджэтам, распачалася ў канцы ліпеня танцавальнымі заняткамі для маладзёжных калектываў „Спадчына" з Беларусі і „Перапёлка" з ГДК. Маладыя танцоры вучыліся ў клубе „Карына", побач Семяноўскага вадасховішча, беларускіх і польскіх танцаў. У пачатку верасня ў амфітэатры выступілі фальклорныя калектывы з Гайнаўшчыны, якія ўдзельнічалі ў аглядах беларускай песні і вакальныя, фальклорныя калектывы з Беларусі. Танцавала перад публікай моладзь з Беларусі і Гайнаўшчыны. У пачатку кастрычніка адбыліся спартыўныя спаборніцтвы і выступілі мастацкія калектывы. У валейбольных змаганнях прынялі ўдзел каманды са Свіслачы і Гайнаўскага павета. Перамагла каманда са Свіслачы з вынікам 4:0. Удзельнікі фэсту ў амфітэатры маглі прыняць удзел у спартыўных конкурсах. Жыхары Гайнаўшчыны і госці з Беларусі скакалі на адлегласць, правяралі футбольныя і баскетбольныя здольнасці. У завяршальным канцэрце перад публікай выступілі дзіцячыя і маладзёжныя калектывы. Побач беларускіх песень, час ад часу гучалі польскія — з рэпертуару калектываў з Гайнаўшчыны. „Знічка" з белліцэя і „Рамонка" з Ласінкі прэзентавалі фальклорныя песні, якія спяваліся на вёсках Гайнаўшчыны. Вучні з гмінных школ Гайнаўшчыны прадставілі эстрадныя песні. Сярод выступаючых было многа танцавальных калектываў. Народныя і сучасныя маладзёжныя танцы паказалі вучні з калектываў „Перапёлка" і „Ілюзія", якія дзейнічаюць пры Гайнаўскім доме культуры. Танцавалі дзеткі і моладзь са школ у Чыжах, Нарве і Нараўцы. Вучні з Камянца, Свіслачы і Пружан побач танцаў прэзентавалі беларускія песні.

— Удзельнікі сустрэч мелі нагоду пазнаёміцца з песнямі, мовай, народным рукадзеллем і вопраткай суседзяў з-за мяжы. Некаторыя беларускія госці былі ў Польшчы першы раз, — заявіў дырэктар ГДК Андрэй Скепка.

Моладзь з Гайнаўшчыны і прыгранічных тэрыторый Беларусі вывадзіцца з асяроддзяў з падобнымі традыцыямі і фальклорам. Аднак сёння культура, у якой выхоўваюцца маладыя людзі ў абедзвюх краінах — розніцца. Маладыя ўдзельнікі сустрэч з Беларусі размаўлялі найчасцей між сабой на рускай мове, а моладзь з Гайнаўшчыны — на польскай.

У час фэстаў можна было купіць вырабы з ракіты і драўніны. Госцям паказалі турыстычныя атракцыёны Гайнаўскага павета.

**Аляксей Мароз**

# Ратавальнікі жыцця

30 лістапада г.г. на сесіі Рады гміны ў Нараўцы старшыня Славамір Кулеша і войт Мікалай Павільч сардэчна павіншавалі і ўручылі рэчавыя ўзнагароды заслужаным ганаровым донарам. Атрымалі іх: Адам Васільчык (аддаў ён больш 12 літраў крыві) і Малгажата Калэцкая (6 л.) — абое з Нараўкі, Рафал Харкевіч (8 л.) з Міхнаўкі, Тамаш Мядзведзь (7 л.) з Сушчага Барка і Мацей Харашэўскі (6 л.) з Пароcлага. **(мох)**

# Звесткі пра Гамульскіх

У рэдакцыю „Газеты Слонімскай", дзе я працую, на днях прыйшоў ліст ад журналісткі крупскай раённай газеты „Крупскі веснік" (Мінская вобласць) Таццяны Талкачовай. Жанчына ў прыватнасці піша: „Шаноўны спадар Сяргей! Гэты ліст Вам можа здацца недарэчным. Але я даведалася, што Вы часта бываеце на Беласточчыне і ў Вас там шмат знаёмых і сяброў. Справа ў тым, што родныя брат і сястра майго бацькі яшчэ да вайны працавалі ў г. Цехановец былой Беластоцкай вобласці. Пасля вайны і да гэтага часу мы не маем звестак аб іх лёсе, хаця мой тата — Гамульскі Віктар Сцяпанавіч — неаднаразова рабіў запыты. На жаль, сёння няма ўжо сярод нас і таты. Вельмі хацелася б, каб Вы, калі будзеце на Беласточчыне, пацікавіліся пра лёс Пятра Сцяпанавіча і Марыі Сцяпанаўны Гамульскіх".





Вось такі ліст прыйшоў да аўтара гэтых радкоў з Мінскай вобласці. Разам з пісьмом журналістка праслала фотаздымкі Гамульскіх. Дарэчы, у кнізе „Памяць. Крупскі раён" ёсць невялікія звесткі пра Марыю і Пятра Гамульскіх. Марыя нарадзілася ў 1920 годзе. Пасля заканчэння Белдзяржуніверсітэта ў 1941 годзе, працавала сакратаром райкама камсамола ў г. Цехановец былой Беластоцкай вобласці. Прапала без вестак у чэрвені 1941 года.

Пётр нарадзіўся ў 1910 годзе. У 1930-я гады працаваў сакратаром Крупскага райкама партыі. У канцы 1939 года быў накіраваны ў г. Цехановец былой Беластоцкай вобласці, дзе да чэрвеня 1941 года быў сакратаром райкама партыі. Прапаў без вестак у пачатку вайны.

З гэтых біяграфічных звестак добра відаць, што дзякуючы старэйшаму брату Марыя Гамульская прыехала і ўладкавалася на працу ў Цехановец. І калі пачалася вайна, яны кудысьці зніклі. Магчыма іх расстралялі немцы, ці яны разам уцяклі далей ад вайны. Усё ж хочацца верыць, што на Беласточчыне іх памятаюць старэйшыя жыхары. І нехта, пасля гэтай публікацыі, адгукнецца і напіша ў „Ніву". А можа жывуць дзеці і ўнукі Гамульскіх, якіх шукаюць і чакаюць сваякі ў Беларусі? Хочацца спадзявацца ў гэта тым больш, што надзея заўсёды памірае апошняй.

**Сяргей Чыгрын**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 981 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

## *„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка*

Дырэктар фірмы кліча свайго прэс-сакратара:

— Наша фірма невысока каціруецца ў мас-медыях. Прыдумай нешта, каб было танна, каб усе мас-медыі гэта асвятлялі і каб наш працоўны калектыў таксама быў задаволены.

— Найлепш было б, калі б вы павесіліся: вяроўка танная, усе пра гэта гаварылі б ды і персанал быў бы рады.

***

Размова перад будынкам нью-йоркскай біржы:

— Здароў, Джон! Як табе жывецца?

— Спекулюю на мінах.

— Гэта акцыі высокай каціроўкі! Адкуль маеш на іх грошы?

— Ты мяне няправільна зразумеў. Я стаю тут, каля дзвярэй, і калі нехта выходзіць з задаволенай мінай, прашу ў яго пазыкі.

***

Прафесар медыцыны паказвае студэнту картачку:

— Тут бачыце канкрэтную хваробу і адпаведнае лякарства ад яе. Колькі пілюль запісалі б вы хвораму?

— Пяць.

Прафесар просіць студэнта сесці. Праз тры мінуты студэнт падымае руку:

— Пан прафесар, хачу змяніць адказ.

— Запозна, малады калега. Ваш хворы памёр трыццаць секунд таму.

***

Двух карцёжнікаў сядаюць за стол. Адзін з іх бярэ калоду карт, тасуе яе і кажа:

— Не хапае тут аднае карты.

Другі з іх бярэ тую калодку, узважвае яе ў далоні і ўдакладняе:

— Маеш рацыю, не хапае аднае карты: жалудовага валета.

***

Настаўніца пытае дзяцей:

— Хто ведае, з чаго вырабляюць каўбаску?

Ніхто не адказвае. Настаўніца звяртаецца да Янкі:

— Ты павінен ведаць, бо твой тата працуе мясніком.

— Я ведаю, але татка сказаў, што калі каму-небудзь гэта скажу, дык мяне заб’е.

***

Ліцэіст рашыў штудзіраваць медыцыну і раіцца бацькі:

— Не ведаю, ці паступіць на кардыялогію, ці на стаматалогію...

— Я на тваім месцы стаў бы дантыстам: чалавек мае толькі адно сэрца, а колькі зубоў!

*Віншуем **Юрыя Каліну** з узнагародай Саюза польскіх журналістаў за фільм „Партызанская школа”.*

*Рэдакцыя «Нівы»*

***

Малады тыгр упершыню ўдзельнічае ў цыркавым прадстаўленні дрэсіроўкі; зацікаўлены пытае мацеру:

— Хто там сядзіць?

— Гэта гледачы, але іх не трэба баяцца, бо яны ўсе за кратамі.

# Музычныя навіны

У чарговы раз у Бельску-Падляшскім са сваім канцэртам выступілі хлопцы з бярозаўскага гурту „Без Назвы”. Гэтым разам канцэрт адбыўся 4 снежня ў клубе „Бункер”. Менавіта ў гэтым жа клубе „БН” выступаў сёлета і 2 кастрычніка. Другі раз у Бельску і другі раз у якасці зоркі. Трэба ўдакладніць, што гэты канцэрт быў даволі складанай падзеяй. На самым пачатку выявілася, што тэхнічнае абсталяванне далёка непрафесійнае дзеля такога канцэрта. Усё ж, як кажуць, дастаткова хацець і ўсяго можна дасягнуць. Крыху падумалі над тэхнікай і ўдалося. Канцэрт пачаўся з трохгадзінным спазненнем. Пачалі госці з Варшавы, пасля былі панкі з Сухаволі, а перад самым „БН” выступіў ужо вядомы беластоцкі гурт „Дамініум”, які пасля свайго выступлення заахвочваў усіх да слухання „БН”. Але нікога заахвочваць не было трэба. Усе сабраныя чакалі гасцей з Беларусі. І так бярозаўцы пачалі граць недзе а першай, а можа і другой уначы. Ні адтуль ні адсюль зала запоўнілася публікай. Лідэр „БН” Алесь Лютыч у пэўны час выступлення вырашыў запытаць ці ўсё добра, калі пачуў адказ што „дооообра”, заявіў: „Дык добра што добра”.

Канцэрт трываў амаль дзве гадзіны. Публіка амаль усе песні спявала супольна з Алесем. А калі „БН” пачаў граць гіт „Толькі я”, дык бывала, што сабраныя спявалі прыпеў нават галасней за сам гурт. Калі пачаліся бісы, зараз некаторыя з публікі вырашылі ўвайсці на сцэну і спяваць у мікрафон разам з хлопцамі. У якасці падзякі за чарговае запрашэнне ў Бельск-Падляшскі Алесь Лютыч запрасіў на сцэну арганізатара канцэрта Юрку Максімюка і разам з ім праспяваў песню „Трывай”. Трэба сказаць таксама некалькі слоў пра мастацкае афармленне канцэртнай афішы, якую размаляваў вядомы мастак з Бельска-Падляшскага Міраслаў Здрайкоўскі. На афішы прыйсці на канцэрт заахвочвала чараўніца зачараваная ў дрэва. Падсумоўваючы трэба сказаць, што „БН” у чарговы раз паказаў свой вялікі прафесіяналізм ва ўмеласці супольнага дыялогу з публікай. Безумоўна тэхнічныя ўмеласці інструменталістаў каманды „Без Назвы” і вакальныя якасці Алеся Лютыча робяць гурт адным з лепшых у Беларусі. Чакаем чарговага канцэрта. Гэтым разам можа не ў Бельску, а, напрыклад, у Гайнаўцы або ў Беластоку.

**Татка Стэп**

# *Адгаданка*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | 40 |
| 41 | 42 | 43 | 44 | 45 | 46 | 47 | 48 | 49 | 50 |
| 51 | 52 | 53 | 54 | 55 | 56 | 57 | 58 | 59 | 60 |
| 61 | 62 | 63 | 64 | 65 | 66 | 67 | 68 | 69 | 70 |
| 71 | 72 | 73 | 74 | 75 | 76 | 77 | | | |

## *Шыфраграма*

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Дароты Паркер.

1. без яго дыму не бывае = 75 _ 76 _ 77 _ 74 _ 70 _;
2. вырабленая авечая шкура = 37 _ 38 _ 9 _ 10 _ 11 _ 12 _;
3. Васіль, аўтар „Сцяны” (1924-2004) = 61 _ 62 _ 55 _ 54 _ 44 _;
4. транспартны сродак з агглоблямі = 13 _ 56 _ 32 _;
5. сын або дачка = 17 _ 18 _ 19 _ 69 _ 7 _;
6. узбярэжны рухомы пясчаны нанос = 45 _ 46 _ 52 _ 53 _ 60 _;
7. жонка Адама = 43 _ 66 _ 67 _;
8. далонь з пальцамі рукі складзеная для зачэрпвання = 26 _ 27 _ 31 _ 29 _ 30 _;
9. студзень, снежань і люты = 6 _ 4 _ 24 _ 23 _;
10. муж дачкі = 22 _ 28 _ 20 _ 21 _;
11. гаспадар маскоўскага маўзалея = 39 _ 40 _ 41 _ 35 _ 42 _;
12. аўтар трэцяга Евангелля = 3 _ 25 _ 36 _ 33 _;
13. частка хаты, з якой дзверы ў пакоі, кухню = 68 _ 47 _ 58 _ 51 _;
14. вялікая драпежная неядавітая трапічная змяя = 71 _ 73 _ 72 _ 8 _;
15. беспарадак, блытаніна = 15 _ 59 _ 16 _ 48 _;
16. сасок у млечнакормячых жывёлін = 34 _ 14 _ 50 _ 1 _ 2 _;
17. атрута = 49 _ 5 _;
18. ізраільскі патрыярх, якому прыснілася лесвіца ад зямлі да неба = 63 _ 64 _ 65 _ 57 _.

**(Ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 45 нумара**

Бэз, Вісла, Лука, Ной, сын, Хам, цана, Ціса, шаль.

Рашэнне: **Каб сонца засланіць, вушэй аслiных мала.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Паўліне Паўлючук** і **Элі Анджаеўскай** з Дубіноў.

# 19.12 – 25.12



**Баран (21.03. — 19.04.)** Марс 25.12. дадасць табе адвагі, баявітасці і аптымізму. Узрасце амбіцыя і апетыт на павышэнне на працы, будзеш старацца паказаць сваю кампетэнтнасць.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Засмакуеш у прыемнасцях, якія дае каханне. Да 21.12. можаш узяць звычайнае ачараванне за сапраўдную любоў. Будзеш мець вялікі поспех у іншага полу. Не пазычай і не паручай грошай.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Будзеш дваіцца і траіцца, займаючыся сваімі і чужымі справамі. Знакаміты кантакт з дзяцьмі. Не старайся нічога прыспешваць.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Чакае цябе праца на ўсю катушку. Да 21.12. можаш знайсці творчы выхад з важнае справы. 21.12. больш часу для партнёра. Будзе больш выдаткаў.

**Леў (23.07. — 22.08.)** З 23.12. (да 27.12.) будзеш мець нагоду выказацца спрытам і рэфлексам. Ахвотна выберашся кудысьці з дзецьмі (знакаміты кантакт). Калі ты Леў не свабодны — фліртуй памяркоўна! Добры час на перасяленне на новую кватэру (памогуць сябры). З 23.12. да канца года — адважныя інвестыцыі і знакамітыя ідэі.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Усё кружыцца вакол сям’і. 21.12. пачнецца час спрыяльны для раманаў, вясёлай забавы ды іншай „разрыўкі”. Можаш атруціцца ежай. Хтосьці з сям’і можа пакінуць дом.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Да 21.12. — асцярожна з выбарамі. Можа пакінуць цябе вясёлы настрой. Неахвота выходзіць з дому (там міла і прыемна!) Займальныя новыя асобы. Можаш дазволіць на большыя выдаткі.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Каля 20.12. ахопяць цябе дзікія эмоцыі, жарсці, але і неспакой. Прыдасца адпачынак. Да 21.12. будзь асабліва разважлівы ў рашэннях. Незалежнасць і самадастатковасць. Паладзь справы ў сям’і (трэба дыпламатыі!). Неператамляйся на працы.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Не паводзь сябе экстравагантна, каб пасля не шкадаваць. Спраўна ўправішся з пакупкамі, парадкамі, кухняй. Не паўтарай старых памылак у каханні, шчыра паразмаўляй. Будзеш добра адчуваць сябе ў новым асяроддзі.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Калі хочаш штосьці змяніць у якасці ці пачаць усё нанова, пачакай да 21.12. Напоўніць цябе тады пазітыўная энергія, адчуеш самаўпэўненасць. Зможаш перанесці горы!

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Да 21.12. будзь асцярожны з дамовамі. З 23.12. будзеш радасны і поўны новых ідэй. Нікому з табой не будзе нудна, і маюць яны для цябе неспадзяванкі. Не дай сябе зняволіць — ні адно каханне таго нявартае! Вадалей нешчаслівa закаханы хутка пазбіраецца ў новым асяроддзі.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Да 21.12. будзеш раздражнены, злосны, упарты. Але не страціш сімпатыі асоб, якія раней за табою не прапалі. Пасваранныя пары яшчэ мусяць патрываць. Варта быць талерантным і даць іншым таксама крыху свабоды.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960